Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неыскарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрлі папярэд тэксту 1 р. — к. За радок капітэрлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГО'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЕЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 166 (2354) Пятніца, 20-га ліпеня 1928 г.

VI КАНГРЭС КАМІНТЭРНУ.

ДРУГОЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ КАНГРЭСУ.

На другім пасяджэньні кангрэсу Камінтэрну, якое адчынілася вечарам 18-га ліпеня, старшыня Сэмар прадставіў кангрэсу прысутнічаючага на кангрэсе аўтара „Інтэрнацыяналу" Дажойтэра. Дэлегаты Кангрэсу зрабілі Дажойтэру гарачую авацыю і віталі яго пяяньнем „Інтэрнацыяналу". Затым кангрэс вітаў ад імя рабочых чыгуначных майстэрняў імя т. Сталіна т. Жураўлёў і ад імя дэлегацыі сходу цэнтрасаюзу, які адбываецца ў Маскве, упаўнаважаны т. Гаўрыленка. Пасьля прывітальных прамоў слова было дадзена Бухарыну для дакладу аб дзейнасьці Выканкому Камінтэрну.

АДОЗВА КАНГРЭСУ ДА РАБОЧЫХ І ПРАЦОЎНЫХ МАС КІТАЮ.

МАСКВА, 18-VII. У адозьве кангрэсу Камінтэрну да рабочых і працоўных мас Кітаю, прынятай на пасяджэньні 17-га ліпеня па прапазіцыі японскай, ангельскай і амэрыканскай дэлегацый, гаворыцца: пралетарыят усіх краін з болем надзяляе смутак вашых няжкіх страт, з радасьцю і захапленьнем сустракае вашы перамогі. Зьвяржэньне імпэрыялізму ў Кітаі—прарыў на галоўнейшым вучастку сусьветнага імпэрыялістычнага фронту—вымагае самаахвярнасььці і вытрымкі і працоўныя Кітаю зьдзіўляюць увесь сьвет сваёй адвагай і адданасьцю рэвалюцыйнай справе сваёй гэройскай нагардай да сьмерці. Кангрэс заўважае, што ён ганарыцца сваім авангардам у Кітаі, зьдзіўляючы хуткім разьвіцьцём і ростам кампартыі, тым гэраізмам, з якім яна ідзе ў перадніх радах барацьбітоў, тэй неўстрашлівасьцю, з якой яна выкрывае і выпраўляе памылкі ў сваіх радах. Няма такой прыгнечанай краіны, куды-б не далятала рэха заклікаў рэвалюцыйнага Кітаю. Усходы ў калёніях і паўкалёніях, дзе пралетарыят сьвядома вызначае этапы нацыянальна-рэвалюцыйнай барацьбы, перад ім станіць, як канчаткова мета, дзёзугі, якія гарэлі на сьцягу кантонскіх гэроеў. Міжнародны пралетарыят аддае сабе ясную справаздачу ў тым, што ваша барацьба падрывае падваліны капіталістычнага ладу, што вы зьяўляецеся ўдарным атрадам пралетарскай рэвалюцыі. Камуністычны Інтэрнацыянал лічыць неабходным заявіць, што да сёньня пралетарыяту капіталістычных краін, як гледачы на гэраізм асобных яго прадстаўнікоў, не пашчасьціла зрабіць дастаткова моцнай абароны раработніцка-сялянскай рэвалюцыі ў Кітаі. 6-ы кангрэс бача адну з сваіх галоўнейшых задач у арганізацыі міжнародных сіл пралетарыяту для падтрыманьня нацыянальна-рэвалюцыйнай барацьбы, для пасьпяховасьці перамогі рэвалюцыі ў Кітаі. Кантонскае паўстаньне ўвайшло ў сьвядомасьць працоўных, як прыклад найвялікшага гэраізму кітайскіх рабочых. Няхай будучае паўстаньне найнырайшых рабочых і сялянскіх гушчаў, арганізаванае на вытрыманых і пасьлядоўна праверэных прынцыпах ленінізму, падтрымае міжнародным пралетарыятам, будзе вялікапераможным Кастрычнікам для Кітаю.

АДОЗВА КАНГРЭСУ ДА РАБОЧЫХ І СЯЛЯН УСЯГО СЬВЕТУ.

МАСКВА, 18-VII. У адозьве да рабочых і сялян усяго сьвету аб падтрыманьні 2-хтыдневіка дапамогі кітайскаму пралетарыяту, кангрэс Камінтэрну заклікае ўсіх рабочых, сялян і ўсіх опачуваючых нацыянальнаму і сацыяльнаму вызваленьню кітайскага пралетарыяту, усімі сіламі падтрымаць міжнародны двухтыдневік дапамогі кітайскаму работніцкаму руху, які (двухтыдневік) праводзіцца Прафінтэрнам з 17 па 31 ліпеня.

ПАЛІТВЯЗЬНІ НЯМЕЦКІХ АСТРОГАЎ ВІТАЮЦЬ VI КАНГРЭС.

МАСКВА, 19-7. Вызваленыя з нямецкіх вастрогаў палітычныя вязьні паслалі VI кангрэсу Камінтэрну наступную тэлеграму: „Вызваленыя з нямецкіх вастрогаў палітычныя вязьні шлюць генэральнаму штабу ўсясьветнай рэвалюцыі самае палкае і баявое прывітаньне, выказваюць пажаданьне, каб праца кангрэсу прывяла да як найхутчэйшага зьвяржэньня панаваньня буржуазеі ў капіталістычных дзяржавах".

Рабочыя Гамбургу вітаюць VI кангрэс Камінтэрну.

МАСКВА, 19 VII. З Гамбургу атрымана наступная тэлеграма: „тысячы рэвалюцыйных рабочых і работніц Гамбургу, удзельнікі мітынгаў, вітаюць звольненых палітвязьняў і вітаюць чырвоны штаб усясьветнага пралетарыяту—VI кангрэс Камінтэрну".

Хуткі тэмп працы кангрэсу.

ШМАТ ПРЫВІТАНЬНЯЎ.

У прэзыдыум кангрэсу Камінтэрну штодзённа надыходзе шмат прывітаньняў ад партыйных і рабочых арганізацый з усіх канцоў СССР. Кангрэс праходзе нараўнаўча хуткім тэмпам, дзякуючы дасьціпнаму ўдасканаленьню: радыё-перадачы прамоў на ўсіх мовах. Унізе ная трыбуны прамоўцы знаходзіцца спэцыяльная лёжка, дзе сядзяць перакладчыкі, якія ў момант перамяжаюць прамовы на ўсе асноўныя мовы. У кожнага дэлегата маюцца радыё-навушнікі з штэпсэлем, які па жаданьні злучаецца з якім хочаш перакладчыкам. Такім чынам, дэлегаты бачаць прамоўцу і чуюць яго на любой зразумелай мове.

Парадак пасяджэньняў кангрэсу.

МАСКВА, 19-VII. 20-га ліпеня раніцнага пленарнага пасяджэньня на будзе. Удзельнікі кангрэсу заняты не пасяджэньнях дэлегацый. Чарговае пленарнае пасяджэньне адбудзецца 20 ліпеня ў 5 гадзін вечара. На парадку дня: дыскусіі па дакладу тав. Бухарына.

У Саюзе ССР.

Выступленьне Рыкава на сходзе ўпаўнаважаных Цэнтрасаюзу.

ШЛЯХІ РАЗЬВІЦЬЦЯ НАШАЙ КААПЭРАЦЫІ.

МАСКВА, 18-7. На пасяджэньні сходу ўпаўнаважаных Цэнтрасаюзу 18-га ліпеня выступіў т. Рыкаў, сустрэчаны бурнай авацыяй усяе залі.—У сучасны момант,—сказаў т. Рыкаў,—некаторыя таварышы з асяродку кааперацыйных працаўнікоў ужо гавораць аб тым, што ў галіне кааперавання тавараабароту зроблена даволі і што трэба пераходзіць выключна да вытворчай працы. Не згаджаючыся з гэтым, т. Рыкаў зазначае, што і ў галіне тавараабароту перад намі стаіць яшчэ большыя задачы; значная частка сялянскіх гаспадарак да гэтае пары мае паўнатаральны характар. Іх трэба ўцягнуць у тавараабарот. У якасных адносінах праца нашых кааперацыйных органаў патрабуе яшчэ шмат. Як у арганізацыі рынкавых адносін у краіне, так і ў палепшаньні працы кааперацыйнае сыстэмы перад краінай стаіць вялізныя задачы. Гаспадарчыя цяжкасьці і памылкі сучаснага году знайшлі свой яскравы адбітак у сфэры тавараабароту. Памылка цэнтральных урадавых органаў у тым, што для вёскі ня была своечасова выдзелена патрэбная колькасьць тавараў. Але далей ўжо пашлі памылкі тавараправодзячае сеткі і ў першую чаргу—кааперацыі, якія выявіліся ў недастатковай гнуткасьці ее апарату, у недастатковым вучоце попыту, у неправільным перакіданьні тавараных мас і інш. У справе выпісьненьня прыватнага капіталу з рынку мы дамагліся многага. Аднак, трэба прызнаць, што ў некаторых ваадасобных выпадках кааперацыя ня здолела поўнасьцю замяніць выпісьненага з абароту прыватніка. Для разьвіцьця сваёй гавадзёвай сеткі яна патрабуе вялікіх сродкаў. На гэтым сходзе ўпаўнаважаных чуліся галасы, што ўрад саюзу павінен абясьпечыць кааперацыі атрыманьне гэтых новых сродкаў. Зразумела, урад дапамагаў і будзе дапамагаць кааперацыі; але кааперацыйныя арганізацыі настолькі ўмацаваліся і накапілі такі вопыт, што гэтыя сродкі кааперацыя павінна адшукаць, галоўным чынам, у сябе самой. Па меры выцісканьня прыватніка паступленьне падаткаў ад прыватнага гандлю будзе вымяншацца, і гэта зусім натуральна, бо набываць наша новае таварыства за кошт сродкаў непманаў і кулакоў мы, вразумела, ня можам. Мы-ж іх імкнемся выціснуць і з кожным годам выціскаем усё мацней. Таму, павінны павялічвацца іншыя крыніцы прыбытку. Таму я не магу абяцаць, гаворыць т. Рыкаў, што падатковыя прыбыткі ад спажывецкае кааперацыі ў бліжэйшыя гады будуць палегчаны. Неабходна забясьпечыць рост сродкаў кааперацыі за кошт павялічэньня колькасьці яе членаў, паступленьня членскіх узносаў, рацыяналізацыі тавараабароту, вымяншэньня выдаткаў абароту і інш. Закранаючы далей дачыненьні насельніцтва ў спажывецкай кааперацыі, т. Рыкаў зазначае, што было-б вялікаю пабясьпекаю для кааперацыі, калі-б насельніцтва бачыла ў ёй бюракратычную арганізацыю. Таму неабходна далейшае разьвіцьцё грамадзкіх пачаткаў кааперацыі, праца якой павінна грунтавацца на самадзейнасьці шырокіх працоўных мас. Нажаль за апошні час адзначаўся шэраг выпадкаў простага адміністрацыйнага ўмешваньня ў дзейнасьць кааперацыі. Кааператары зусім справядліва проці гэтага пратэставалі. Неабходна, каб ва ўсёй сваёй дзейнасьці кааператары абапіраліся на сьвядомае самадзейнае падтрыманьне рабочых і асноўнай масы кааперуючага сялянства.

5-цігодзьдзе службы тав. Чубара на пасадзе старшыні СНК УССР.

ХАРКАЎ, 13-7. Вялікі Прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК адзначаў 5-ці гадовае знаходжаньне т. Чубара на пасадзе старшыні СНК УССР. Прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК пастанавіў паслаць т. Чубару, які ў сучасны момант знаходзіцца ў водпуску, прывітальную тэлеграму. Прэзыдыум Усеукраінскага ЦВК, у адзнаку 5-цігадовага знаходжаньня т. Чубара на пасадзе СНК УССР, аднагодна пастанавіў узнагародзіць яго ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу за бязупынную і карысную працу ва ўсіх галінах дзяржаўнага і гаспадарчага жыцьця УССР. Пастановула такзама ўнесьці на абмеркаваньне бліжэйшае сесіі Усеукраінскага ЦВК пытаньне аб узнагароде тав. Чубара ордэнам Чырвонага сьцягу.

Індыйскія нацыяналісты аб Аўганістане, Англіі і СССР.

КАБУЛ, 18-7. У органе індыйскіх нацыяналістых „Форвард" надрукаваны артыкул Нэру пад загалоўкам: „Антысавецкія пляны рухнулі". Англія,—гаворыцца ў артыкуле,—з усіх сіл імкнулася зачараваць аўганскага падышаха, жадаючы паказаць яму сваю магутнасьць. Баючыся савецкага ўплыву, яна ўсялякімі хітрасьцямі хацела перашкодзіць паездцы падышаха ў СССР. Але ён усё-ж такі паехаў у СССР і выкарыстаў момант аддаць доўг вялікаму чалавеку, творам якога зьяўляецца Расея сёнешніх дзён. Падышах добра вразумеў, адкуль яму можа пагражаць небясьпека. Ён абмовіўся ад саюзу з Англіяй. Далей Нэру піша аб няўнікненьні вайны і аб росьце небясьпекі для Аўганістану з боку Англіі, якая,—піша Нэру,—ня будзе чакаць выпадку для нападу і абвяшчэньня вайны. Яна возьме на сябе ініцыятыву абвяшчэньня вайны Савецкаму Саюзу і абойдзецца з Аўганістанам так, як Нямеччына абышлася з Бэльгіяй у 1914 годзе.

Падрыхтоўка да агрэсыўнага руху ня спыняецца. Нэру заяўляе, што нават маленькая Бэльгія магла супроцьпаставіцца нямецкай арміі ў працягу некалькіх тыдняў, а Аўганістан яшчэ ў большай меры супроцьпаставіцца плянам брытанскага генштабу. У заканчэньне Нэру піша: «лекцыя, якую павінны мы зазубрыць, заключаецца ў тым, што ва ўзаемаадносінах з Англіяй мы займаем пакуючае становішча і можам дыктаваць ёй свае ўмовы. Мы ў стане перашкодзіць вайне, якую захоча Англія выклікаць згодна з свае імі імпэрыялістычнымі інтарэсамі.

Сялянскі рух у Індыі пашыраецца.

МАСКВА, 8-7. З Кабулу паведамляюць, што сялянскі рух у раёне Бардолі (Індыя), выкліканы нязносным цяжарам падатку, разрастаецца. Да руху далучыліся юнацкія арганізацыі. Кіраўнік руху Балабхай—Патэр заявіў на мітынгу ў Бамбеі: «Хай урад накіруе на нас гарматы. Сялянства ня ўступіць сваіх пазіцый. Лепш сьмерць, чым ганебны мір.

8000 чалавек загінуць, але справа індыйскага сялянства будзе жыць».

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

БАРТЭЛЬ ВЫЕХАЎ ПАД САКРЭТАМ...

ВАРШАВА, 18-7. У водпуск выехаў польскі прэм'ер Бартэль. Па словах прэсы, як самы выезд Бартэля, так і падрыхтоўка да яго, адбыліся ў сурова сакрэтным парадку, так што нават шофэр, які адвозіў Бартэля, ня ведаў, куды ён едзе. Ходзяць чуткі, што Бартэль выехаў цераз Нямеччыну ў Францыю.

«ВЫЗВАЛЕНЬНЕ» ПАГРАЖАЕ АКТЫЎНА БАРАНІЦЬ ДЭМАКРАТЫЧНЫ ЛАД.

ВАРШАВА, 18-7. Цэнтральны камітэт «Вызваленьня» прыняў рэзалюцыю, у якой асуджаецца інтэрв'ю Пілсудзкага ад 1 ліпеня з вострымі выпадамі супроць сойму. Рэзалюцыя папераджае тых каго гэта датычыць, што народныя масы будуць актыўна абараняць дэмакратычны лад ад усялякіх рэакцыйных выступленьняў.

ЗАБАСТОЎКА ПАРАБКОЎ.

У маёнтках Пературасоўшчына і Каменка, Горадзенск. пав., якія належаць кн. Сапезе, выбухла забастоўка парабкоў. Забастоўка ўзьнікла з прычыны невыплаты заработкаў.

ВЫЗВАЛЕН З АСТРОГУ БЕЛ. КЛЕРЫКАЛЬНЫ ДЗЕЯЧ—КС. ГАДЛЕЎСКІ.

На аснове абвешчанай у Польшчы амністыі вызвален з Макатоўскага вастрогу ў Варшаве беларускі клерыкальны дзеяч кс. Гадлеўскі, прысуджаны на 2 гады вастрогу за свае выступленьні ў абарону беларускай мовы ў касьцёле.

ПОЛЬСКІ «ПЭДАГОГ» НА «КРЭСАХ»

Акруговы віленскі суд разглядаў гэтымі днямі справу настаўніка пачатковай школы Адама Крулікоўскага. Гэты пан дазваляў сабе, як піша «Дзеньнік Віл.» (№ 160), вельмі дакладна аглядаць 4-х дзяўчынак, якіх паасобку замыкаў у клясе».

Суд прыгаварыў яго на 3 гады вастрогу.

Лётная катастрофа.

Каля в. Загасьцінец, Радзімінскага пав., здарылася лётная катастрофа, в прычыны сапсаваньня матору. Самалёт амаль вусім разьбіўся. Лётнік застаўся жыў.

СЬПЯКОТЫ Ў ПОЛЬШЧЫ.

У Варшаве і ва ўсёй Польшчы стаіць нябывалая сьпякота, якая даходзіць да 35 градусаў па Цэльсію. Бываюць выпадкі сонечных ударай.

Чэмбэрлен і польска-літоўскія адносіны.

ПАРЫЖ, 19-VII. Камэнтыруючы адносіны Чэмбэрлена да польска-літоўскага канфлікту, лёнданскі карэспандэнт парыскага выданьня «Чыкаго Трыбун» піша: «Чэмбэрлен атрымаў важкія доказы намераў Вальдэмараса прадэманстраваць на васеньняй сэсіі Лігі Нацый бяссільнасьць апошняй. Апрача таго, Чэмбэрлен даведаўся, што літоўскі прэм'ер разьлічвае на падтрыманьне з боку Расеі ў выпадку спробы парушэньня незалежнасьці Літвы, асабліва, калі гэткая будзе зроблена Польшчай. Што тычыцца Польшчы, то яна паведаміла Чэмбэрлена, што будзе лічыць адказнай Лігу Нацый, наскольки польскаму ўраду перашкодзілі ліквідаваць канфлікт сілай. Палякі заявілі Чэмбэрлену, што яны будуць дамагацца ад Лігі поўнага падтрыманьня ўсякага роду мерапрыёмстваў, якія пакажуцца неабходнымі. Прадбачачы няўхільнае зьмяншэньне аўтарытэту Лігі, Чэмбэрлен папярэдзіў Нямеччыну на выпадак магчымасьці небясьпекі і зьвярнуў увагу на патрэбнасьць супольнага выступленьня для ўстрыманьня ліцьвіноў.

ХТО ЗАБОЙЦА АБРЭГОНА?

МЭКСІКО, 18-7. Забойца Абрэгона назваў сябе Хуанам, але думаюць, што гэта імя выдуманае. Дом Мурамэса, лідэра Мэксыканскай фэдэрацыі працы і галоўнага палітычнага працаўніка, ахоўваецца войскам, бо Мурамэс баіцца помсты прыхільнікаў Абрэгона.

НАВАКОЛ ДАГАВОРУ АБ „ЗАБАРОНЕ ВАЙНЫ".

АДКАЗ АНГЛІІ НА НОТУ КЭЛЁГА.

ЛЁНДАН, 18-7. Чэмбэрлен уручыў даверанаму ў справах ПАЗШ ў Англіі адказ ангельскага ўраду на ноту Кэлёга. Урад ад свайго імя і ад імя дамініёнаў заяўляе, што прымае прапановы Кэлёга аб заключэньні «шматбаковага дагавору», забараняючага вайну, як аружжа нацыянальнай палітыкі.

АДКАЗ ЧЭХА-СЛАВАКІІ.

ПРАГА, 18-7. Водпуг паведамленьня Чэха-славацкага тэлеграфнага агенцтва, адказ Чэха-Славакіі на прапанову Кэлёга будзе перададзен пасланьніку Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў у Празе 20-га ліпеня. Чэха-Славакія выказвае ў ёй гатоўнасьць падпісаць шматбаковы дагавор аб забароне вайны, як сродку нацыянальнае палітыкі.

АДКАЗ ПОЛЬШЧЫ.

ВАРШАВА, 18-7. Таварыш міністра замежных спраў зьвярнуўся да пасланьніка Амэрыкі ў Варшаве з нотай, у якой паведамляе аб згодзе Польшчы падпісаць прыпыцаць ёй праэкт дагавора аб «забароне» вайны.

ДАГАВОР АБ „ЗАБАРОНЕ" ВАЙНЫ І СССР.

БЭРЛІН, 18-VII. Газэта «Дойтшэ Альгэмэйнэ Цэйтунг» паведамляе, што пасьля таго, як Францыя і Нямеччына выказалі згоду падпісаць шматбаковы дагавор аб забароне вайны, як сродку нацыянальнай палітыкі, пытаньне аб адносінах да гэтага дагавору СССР зьяўляецца прадметам жвавага абгаварэньня ў палітычных колах як у Нямеччыне, так і замежамі. Апіраючыся на асьведамленый крыніцы, газэта піша: «Па думцы відных дзеячоў Вашынгтона, нішто не перашкаджае далучэньню СССР к пакту Кэлёга. Удзел СССР у гэтым дагаворы нават пажаданы па шмат якіх меркаваньнях, бо захаваньне міру ў нямалай ступені залежыць ад пазіцыі такой вялікай дзяржавы, як Савецкі Саюз. Праўда, Масква пастаўлена перад зьдзейсьненым фактам, бо савецкі ўрад на меў магчымасьці выказаць свае погляды і прапанаваць якія-небудзь зьмены, а дагавор ужо канчаткова фармуляваны. Аднак, гэта на можа служыць перашкодай да ўдзелу СССР у гэтым дагаворы, бо большасьць іншых дзяржаў знаходзіцца ў аднолькавым становішчы".

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. ночы).

ГАЛАДОЎКА ЗЬНЯВОЛЕНЫХ У БРАНДЭНБУРСКАЙ ТУРМЕ.

БЭРЛІН. Галадоўка зьняволеных у катаржнай турме ў Брандэнбурзе цягнецца далей. Галадуюць 210 зьняволеных. Зьняволеныя патрабуюць распаўсюджаньня амністыі на тыя праступленьні, якія былі зроблены пад гнётам сацыяльнай нужды.

ПРАЦЭС УКРАІНСКІХ ТЭРАРЫСТАЎ.

ВАРШАВА, 19. У Львоўскім судзе, у парадку паскоранага судавядзеньня, пачалася справа 9 украінскіх тэрарыстаў, прымаўшых удзел у нападзе на Львоўскую паштовую кантору. Падсудныя разглядаюцца судом, як звычайныя крымінальныя праступнікі, якія дзейнічалі не з палітычнымі мэтамі. Чатыром з іх пагражае кара сьмерці, хоць напад быў няўдалы і ад яго ніхто не пацярпеў. У Львоў прыбыў кат.

Пасьля амністыі ў Нямеччыне.

ВЫЗВАЛЕНЬНЕ МАКСА ГЕЛЬЦА.

БЭРЛІН, 19-7. Учора а 8-й гадз. вечара пасьля 7-хгадовага прабываньня ў катаржнай турме Зоннебурга вызвален Макс Гельц. Вызваленьне адбылося на аснове выданага па хадайніцтву абароны дазволу вярхоўнага суду вызваліць Гельца да перагляду яго справы. Калі Гельц даведаўся пра сваё вызваленьне, то адмовіўся пакінуць турму, калі адначасова з ім ня будуць адпушчаны 4 іншых палітычных, якія падлягалі вызваленьню яшчэ ўчора. Кампартыя заклікае рабочых Бэрліну наладзіць спатканьне Гельцу.

ВЫЗВАЛЕНЬНЕ ПРАЛЕТАРСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ.

БЭРЛІН, 17-VII. З катаржнага астрогу ў Зонзэнбурзе звольнены 14 пралетарскіх палітычных, засужданых у агульнай лічбе на 87 год і 9 месяцаў зьняволеньня і адсядзеўшых агулам 78 год. Амністыраваны Зікоўскі, які адсядзеў 8 год. абвіну Макса Гэльца і заявіў, што ён не пакіне вастрогу без яго. Адміністрацыя гвалтам разлучыла іх. З крэпасьці Гольнаў звольнены 24 пралетарскіх палітычных. З катаржнага астрогу ў Брандэнбурзе—4. Усе амністыраваныя накіраваліся ў Бэрлін, дзе былі ўрачыста спатканы грамадзянстваам.

УРАЧЫСТАЕ СПАТКАНЬНЕ ВЫЗВАЛЕНЫХ У БЭРЛІНЕ.

БЭРЛІН, 18-VII. Для спатканьня амніставаных палітычных, вызваленых з катаржнага астрогу Зонзэнбург і крэпасьці Гольнаў, сабраліся ўчора вялізныя масы народу. Паяўленьне амніставаных выклікала цэлую бурю захапленьня. Уздоўж дарогі, па якой ішла дэманстрацыя, густымі шэрагамі стаяла рабочае насельніцтва, з захапленьнем вітаўшае вызваленых. На плякох, дзе адбываліся мітынгі, гаварылі з некалькіх трыбун. Дэманстрацыі зацягнуліся да позьняе ночы.

Манчжурыя падпарадкавалася Нанкіну

ШАНХАЙ, 18-VII. Японскае тэлеграфнае агенцтва Тахо паведамляе з Мукдэну, што згода між прадстаўнікамі Чжан-Сюэ-Ляна і Чан-Кай-Шы дасягнута на наступных умовах: 1) Манчжурыя падпарадкоўваецца нанкінскаму ўраду. 2) Кіраўніцтва Манчжурыяй рэарганізуецца на аснове т. зв. 3-х прынцыпаў Сун-Ят-Сэна. 3) У Манчжурыі падымаецца гаміндаўскі сьцяг. Па вестках агенцтва, згода будзе ў бліжэйшыя дні зацьверджана абодвымі бакамі.

„Фосішэ Цэйтунг" аб Нобіле і „Красіне"

БЭРЛІН, 16-VII. «Фосішэ Цэйтунг» піша аб захаваньні Нобіле ў часе ратунковай працы экспэдыцыі «Красіна» так: «Да кожнага новага паведамленьня аб самаахвярных учынках каманды „Красіна" Нобіле няўхільна далучае фарсісты выказ свайго погляду на гэты посьпех. Як відаць, Нобіле да гэтай пары яшчэ думае, што ўвесь сьвет вельмі высока цэніць выяўленьне яго гэніяльнасьці. У гэты час руская без гучных слоў, сьцяўшы зубы, працуюць над выратаваньнем апошняга аддзелу каманды «Італіі», з якой, як надзейцца ўвесь сьвет, знаходзіцца і Амундсэн.

„МАЛЫГІН" ВЫШАЎ З ІЛЬДОЎ.

„МАЛЫГІН", 16-7. 17-га ліпеня „Малыгін" пасьля 30 дзён прабываньня між ільдоў, вышаў за кромку ледоў. За гэты час «Малыгін» перанёс два штормы і неаднакраць заціраўся крыгамі.

У ЛІТВЕ.

Майёр Бэрт у Клайпэдзе.

КОЎНЯ, 15-VII. Учора ў Клайпэду прыехаў ангельскі генэрал майёр Бэрт. Яго сустрэў у Клайпэдзе прэзыдэнт Літвы Смэтона.

ЯЎРЭЙСКІ ПАГРОМ.

Польскія віленскія газэты паведамляюць, што ў Янішках, Шавельскага пав., група літоўскіх фашыстаў з арганізацыі «Жалезны воўк» зрабіла яўрэйскі пагром, пры гэтым 30 яўрэяў было паранена і шмат яўрэйскіх крам і памяшканьняў разграблена.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА Ў ЛАТВІІ.

У Латвіі гэтымі днямі выйшла новая беларуская газэта—аднадзёўка «Праца». Газэта трымаецца левага радыкальнага кірунку і прысьвечана надыходзячым у Латвіі выбарам у сойм.

Новы рэкорд лёту на авіэтцы.

ПАРЫЖ, 15-VII. Француская лётніца Басты паставіла новы сусьветны рэкорд бесперапыннага пералёту на авіэтцы з пасажырам. Басты вылецела з аэрадрому Лябуржэ ля Парыжу а 6-й гадзіне і вынізілася ля Данцыгу а 21-й гадзіне., пакрыўшы адлегласьць у 1154 кілёмэтры. Ранейшы рэкорд складаў 868 кілёмэтраў.

ПАНЫ-ПІЛСУДЧЫКІ І СПРАВА БЕЛАРУСКАЙ АСЬВЕТЫ.

„Хоць ты и в новой коже,
Но сердце у тебя все тоже"...
КРЫЛОЎ.

Захапіўшы чужыя землі, на якіх існуюць толькі польскія маёнткі ды дзе-ні-дзе спольшчаныя каталіцкія беларускія вёскі, панская Польшча павяла на іх палітыку самай суровай палянізацыі. У кожнай галіне жыцьця на «Ўсходніх Крэсах», г. е. у Зах. Беларусі і Зах. Украіне моцна адчуваецца гэта спэцыфічная панска-польская тэндэнцыя навязаць польшчыну ўсюды і ваўсім.

Асабліва гэта кідаецца ў вочы, калі мы зірнем у галіну асьветы.

Цяпер у Польшчы на абшарах усёй Зах. Беларусі маецца 24 беларускіх і 42 беларуска-польскіх пачатковых школ. Школы гэтыя толькі па назве беларускія ці беларуска-польскія. Выкладчыкамі ў іх зьяўляюцца палякі і не мясцовыя, а адкуль-небудзь з Галіцыі ці Паznані, якія зусім ня ведаюць беларускай мовы.

Так прадставіў становішча беларускай школы ў Польшчы ня хто іншы, як вядомы нам Янка Станкевіч, выступаўшы з прамоваю па школьным пытаньні ў сойме. Яго мы ня можам абвінаваціць ва ўмысным упрыхільным да польскай дзяржаўнасьці падыходзе да справы. Усім відома, што Я. Станкевіч здружыўся і ўвайшоў у цесны контакт з пілсудчыкамі і санацыйнымі польскімі элемэнтамі, якія прыкідваюцца нібы-та прыяцелямі беларусоў і быццам гатовы нават задаволіць некаторыя балючыя патрэбы шырокіх беларускіх мас.

Нам вядомы ўсе гэтыя прыгожыя і ў той самы час зусім нерэальныя ў польскім жыцьці пункты канстытуцыі, якія гавораць аб поўным раўнапраўі з палякамі ўсіх нацыянальнасьцяў Польшчы. Мы ведаем і прыгожыя абяцанкі ў розных адозвах і дэкляраціях польскіх урадаў, а найбольш самаго марш. Пілсудзкага, які на справе ня выканаў у адносінах да беларусоў яшчэ ніводнай з сваіх абяцанак. Факты нам даказваюць, што ўсялякія палскія абяцанкі зьяўляюцца толькі сродкам разьбіць беларускую грамадзкую думку на паасобныя групы, якія ва ўзаемнай барацьбе аслабляюць адзіны беларускі фронт. Ня лёгка панам разьбіваць гэты фронт, бо ён, урэшце, усё ж-такі вастаецца адналітым. Аднак, часовы посьпех і яны, бывае, маюць. Розныя ласкі на панскія грошы авантурнікі з беларускага боку ўжо нераз налажвалі хаўрус з панамі пілсудчыкамі і завяралі беларускае грамадзянства ў прыхільнасьці да яго паноў пілсудчыкаў. Цяпер, пасьля шматразовых наўдач, апошнюю, відаць, спробу ўзяў на сябе пасол сойму Я. Станкевіч. Ён знаходзіцца ў цесным кантакце з «беспартыйным блёкам супрацоўніцтва з урадам Пілсудзкага».

І вось мы бачым, што як бы ў адказ на выступленьне Я. Станкевіча ў сойме па школьнаму беларускаму пытаньню польскія паслы і сэнатары з «Беспарт. Блёку» ад Віленшчыны і Наваградчыны, арганізаваныя, між іншым, у «Віленска-Наваградзкае кола» «Беспарт. блёку», сабраліся 4 ліпеня г.г. ў Вільні і, пасьля дыскусіі па дакладах сэнатара В. Абрамовіча і пасла К. Акуліча, прынялі наступныя пастановы:

З мэтаю ўрэгуляваньня спраў беларускага школьніцтва «калі лічыць патрэбным і неабходным» вось што:

1) Удзяржаўленьне беларускага школьніцтва ў межах аб'ектыўна абаснованых сьцьверджанымі патрэбамі беларускай людносьці.

2) Зьмена закону ад 31 ліпеня 1924 г., уключаючы некаторыя пастановы аб арганізацыі школьніцтва, у кірунку ўмажлівеньня выконваньня першага яго пункту (аб так званых дэкляраціях, якія бацькі бел. дзяцей павінны былі падаваць інспэктару школ), а таксама спыненьня на грунце школьніцтва нацыяналістычнай барацьбы, дзеля чаго трэба спыніць між іншым школьныя плебісцыты і ўтраквістычную сыстэму (выкладаньне на дзьвюх мовах.

3) Утварэньне ў пачатку наступаючага школьнага году дзяржаўнай беларускай настаўніцкай сэмінарыі ў Вільні.

4) Да часу ўдзяржаўленьня прыватных беларускіх гімназій у Вільні і Наваградку трэба даць ім і інтэрнатам пры іх фінансавую дапамогу ў той ці іншай форме.

5) Ад пачатку надыходзячага новага школьнага году даць гэтым гімназіям дзяржаўныя правы.

6) У выпадку, калі беларускія гімназіі ў Вільні і Наваградку будуць прыняты на дзяржаўнае ўтрыманьне,—прыватныя беларускія гімназіі ў Радашковічах і Клецку павінны быць перароблены на дзяржаўныя сямікласавыя пачатковыя школы, або школы прафэсыянальныя.

7) Утварэньне пры віленскім унівэрсытэце катэдры або лектаратаў беларусазнаўства.

8) Утварэньне пры віленскім школьным кураторыуме аддзелу беларускага школьніцтва, а таксама камісіі для апрацаваньня і выданьня праграмаў навучаньня і падручнікаў для беларускіх школ—з удзелам прадстаўнікоў беларускага асьветніцкага руху.

9) Удзяленьне матар'яльнай дапамогі беларускаму музэю ў Вільні.

10) Увядзеньне ў паўночна-ўсходніх ваяводзтвах школьнага самакіраўніцтва на ўзор школьнага самаўраду ў цэнтральных ваяводзтвах.

Вось пастановы паслоў і сэнатараў «Беспартыйнага блёку», не вядома для каго напісаныя, і невядома, каго і да чаго абавязваючыя. Ад моманту напісаньня гэтых пастаноў «Віленска-Навагрудзкім колам беспартыйнага блёку» да правядзеньня іх у жыцьцё можа прайсьці не адзін дзесятак гадоў, хоць паны пілсудчыкі і „хацелі-б", каб усе іх пастановы былі праведзены ў жыцьцё ўжо гэтай восьнью. Яны, аднак, самі добра ведаюць, што сьвядома падманваюць масы, бо ўсе падобныя пастановы могуць быць праведзены ў жыцьцё толькі шляхам соймавага законадаўства. Сойм-жа зьбярэцца не раней, як восьнью і яму тады будзе не да пастаноў «Віленска-Навагрудзкага кола».

Такім чынам зусім ясна, што словы іх пастаноў былі сказаны на вецер, так сабе, каб перацягнуць на свой бок даверлівыя масы нашых заходніх братоў.

У гэтай хлусьлівай і ганебнай палітыцы паноў пілсудчыкаў дапамагае ім і п. Янка Станкевіч, замяніўшы сваёй фігурай ужо здан

ТЫДЗЕНЬ АБАРОНЫ У БССР.

Тыдзень абароны і задачы прафсаюзных арганізацый БССР.

ТДА-Авіяхіму Беларусі на 1-га красавіка 1928 г. налічвала 144.025 членаў, сярод яхіх членаў прафсаюзаў—71.690 чал., ці 35 проц. членскага складу прафсаюзаў БССР, ці 50 проц. к агульнаму ліку членаў Беларускага ТДА-Авіяхіму. З гэтых лічбаў відаць, што рабочыя (40.000 чал.) недастарчальна ўцягнуты ў ТДА-Авіяхіму.

У прафарганізацыях у некаторай ступені яшчэ існуе недастарчальнае разуменьне кіраўнічай ролі ТДА-Авіяхіму, як арганізацыі, якая праводзіць ваенізацыю працоўных.

У сувязі з гэтым прафэсыянальныя арганізацыі БССР у справе практычнага ажыццяўленьня ваенізацыі сваіх членаў маюць наступныя хібы:

Ёсьць прафарганізацыі, якія часта праводзяць вайсковую прапаганду раўналежна з ТДА-Авіяхімам (арганізацыя вайсковых куткоў, стралковых ціраў, правядзеньне самастойных стралковых спаборніцтваў і інш.) без кіраўніцтва і плянавай работы ТДА-Авіяхіму. Гэта, з аднаго боку, амаль не дае ніякіх вынікаў у справе вывучэньня ваенізацыі, а падругое, адцягвае ўвагу членаў прафсаюзаў ад членства ў ТДА-Авіяхім.

Культасьветныя ўстановы і актыў культарганізацый прафсаюзаў недастарчальна нагружаны масавай работай па вайсковай агітацыі і прапагандзе. Амаль не практыкуюцца справаздачныя даклады па ваенізацыі членаў прафсаюзаў на агульных сходах фабзавямясцкомаў, ня ставяцца даклады на пленумах і зьездах прафсаюзных арганізацый; у рабочых клюбах вельмі рэдка сустракаюцца куткі ТДА-Авіяхіму.

Зараз трэба ўжыць рашучыя меры, каб усю работу прафорганаў запоўніць пытаньнямі плянавай вайсковай агітацыі і прапаганды, што павінна праводзіцца пад агульным кіраўніцтвам арганізацый ТДА-Авіяхіму.

Увогуле, трэба сьцьвердзіць, што існуе некаторы разрыў паміж працай у галіне ваенізацыі, якая праводзіцца арганізацыямі прафсаюзаў і ТДА-Авіяхіму.

Трэба адзначыць, што ў гурткі ТДА-Авіяхіму недастарчальна ўцягнуты члены прафсаюзаў—каля 30-35 членскага складу.

Да гэтага трэба дадаць, што працоўныя найбольш цікавяцца стралковым спортам, але ў гэтай галіне няма мэтавай установкі; спорт не праводзіцца пад лёзунгам ваенізацыі паміж ТДА-Авіяхіму. Вось чаму мы лічым, што агульнае кіраўніцтва стралковым спортам неабходна падначаліць ТДА-Авіяхіму.

Размах работы ТДА-Авіяхіму затрымліваецца з прычыны браку грашовых сродкаў. Тыя сродкі, якія атрымоўвае таварыства ў выглядзе членскіх узносаў, зьяўляюцца далёка невыстарчальнымі і ня могуць задаволіць усе запатрабаваньні. У той час, як членскія ўзносы складаюць з кожнага сябра па 50 кап. у год, толькі на адны патроны патрабуецца па 5 р. на аднаго стралка. Праўда, ТДА-Авіяхіму атрымоўвае некаторыя сродкі ад другіх мерапрыёмстваў, але яны таксама недастатковыя. Прафсаюзы, праводзячы ваенізацыю сваіх членаў праз арганізацыі ТДА-Авіяхіму, да гэтага часу ня выдзелілі па сваіх каштарысах пэўных сум на папаўненьне выдаткаў ТДА-Авіяхіму на ваенізацыю членаў прафсаюзаў. Калі паасобныя мясцовыя прафорганы і праводзяць адлічэньні некаторых сродкаў на ваенізацыю, дык гэтыя адлічэньні праводзяцца ня ўсюды і ня ў роўнай часьці.

У сувязі з гэтым і ўлічваючы дрэннае фінансавае становішча таварыства, мы лічым, што перад ЦСПСБ трэба пасхавіць пытаньне прыняць удзел у выдатках ТДА-Авіяхіму на справу ваенізацыі членаў прафсаюзаў. Гэтыя выдаткі, на нашу думку, павінны мець пэўную норму для ўсіх прафарганізацый і павінны вызначацца плянава па каштарысах: прыблізна па 1 р. 50 кап. у год на кожнага члена прафсаюзу, які навучаецца ў тым ці іншым гуртку ТДА-Авіяхіму, і па 25 кап. на працу ў гурткох.

Апроч гэтага, прафсаюзы павінны ўзяць на сябе выдаткі на абсталяваньне ў прафэсыянальных клюбах цэнтральных ТДА-Авіяхіму куткоў, стралковых ціраў і інш. Побач з гэтым неабходна ўвесьці ў клюбах кіно-карціны і драматычныя пастаноўкі, якія адбівалі-б задачы і мэты абароны краіны і ваенізацыі.

Дзеля ўстанаўленьня плянавай сувязі прафорганаў з ячэйкамі ТДА-Авіяхіму на мясцох, мы высоўваем пытаньне перад ЦСПСБ аб уступленьні ў члены Беларускага ТДА-Авіяхіму ўсіх прафэсыянальных арганізацый, як юрыдычных асоб.

Пры такой увязцы ў працы Беларускага ТДА-Авіяхіму з прафарганізацыямі работа па ваенізацыі працоўных БССР, асабліва арганізаваных у прафсаюзы, бязумоўна, значна пасунецца наперад, і вельмі хутка можна будзе атрымаць станоўчыя вынікі.

І. Чэшка.

Рыхтуемся да чырвонае прысягі

22 ліпеня ў лягеры «Чырвонае Урочышча» адбудзецца вялікае сьвята з прычыны 8-й гадавіны вызваленьня Беларусі з-пад прыгнёту белапалякаў і юбілею 10-цігодзьдзя Беларускай чырвонаштандартнай імя т. Фрунзэ дывізіі.

У гэты дзень у лягеры прыдуць з гораду партыйныя, камсамольскія і рабочыя арганізацыі, а таксама з бліжэйшых вёсак сяляне.

У гэты дзень сыны Беларусі перад тварам рабочых і сялян, адзеўшыся ў вопратку байца Чырвонай арміі, дадуць урачыстае абяцаньне ганарова насіць імя байца рабоча-сялянскай арміі.

Кожны пераменьнік, малады баец дасьць гэтую прысягу з поўным пачуцьцём і сумленьнем, бо ён памятае зьдзекі паноў над працоўнымі Беларусі.

У гэты дзень ён сьцісьне ў сваіх руках стрэльбу і скажа „Я, сын працоўнага народу прыймаю на сябе імя байца—Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі і абяцаю насіць яго з гонарам і ў барацьбе за Савецкі Саюз не шчадзіць ні сваіх сіл, ні свайго жыцьця".—Так, ён не пашкадуе, бо ён помніць, як яго браты старэйшыя, партызаны, аддавалі сваё жыцьцё 8 гадоў таму назад за здабываньне волі. Ён, даючы гэтае ўрачыстае абяцаньне, сьцісьне ня толькі стрэльбу сваімі мазолістымі рукамі, а і зубы пры думцы аб тым, што і дагэтуль яго заходнія браты церпяць зьдзек.

Малады баец—Беларускай дывізіі за два месяцы вучобы добра паказаў сябе ў вайсковай і палітычнай вучобе.

Ён ведае, каму і для чаго дасьць чырвоную прысягу.

Вайскор Я. Бароўскі.

У шэрагі ТДА-Авіяхіму.

Канфэрэнцыя сялян-дасьледчыкаў пастанавіла ў „Тыдзень Абароны» ўцягнуць усіх сяброў Інстытуту сялян-дасьледчыкаў у шэрагі ТДА-Авіяхіму.

Жанчына ў абароне краіны.

(З успамінаў удзельніцы грамадзянскае вайны, жанчыны-чырвонасьцяжніцы т. Л. С. Холадавай).

Тысячы вызваленых працоўных жанчын паказалі гэраізм на франтох грамадзянскай вайны.

У 1917 годзе шмат жанчын было ў шэрагах Чырвонай гвардыі і ў партызанскіх атрадах.

У 1919 годзе—Холадавай давялоня быць некалькі разоў у баёх.

Асабліва памятае яна бой 29-га жніўня...

Гэта быў бой, калі прышлося адступаць з Кіева, ад Даянікіна, а насустрач ішоў Пятлюра, у якога была вялікая перавага сіл.

Тады полк зьвярнуў у лес ля вёскі Дзьмітраўкі.

Тут мясцовыя кулакі абстрэльваюць,—а ноч,—як быццам хто чарнілам заліў, і дождж...

Нашым камандаваньнем была вызначана разьведка—5 пешых і 2—конных—тав. Холадава—на чале...

Пад'яжджаючы к станцыі Ірпеня—раптам пачуліся стрэлы. Рашылі, што станцыя занята ворагам.

Па загаду камандаваньня разьведка зьвярнула на станцыю Буча.

Полк акапаўся каля цагельнага заводу, а тав. Холадава—пашла на станцыю, пакінуўшы недалёчка разьведчыкаў.

Прышоўшы на станцыю, яна перш за ўсё зайшла на тэлеграф. Сядзелі там служачыя,—а тэлефаністка з белымі размаўляла.

ХОЛАДАВА Л. С.
(Нагар. орд. Чырв. Сьцягу за Удзел у грам. вайне).

Перш за ўсё запыталася—ці няма цягніка на Кіеў?

Я—з Дзімітраўкі...

Сьмяяліся над ей і параілі ісьці дамоў спаць.

Выйшла са станцыі, параілася з чырвонаармейцамі-разьведчыкамі, што і як рабіць.

Умовіліся ісьці разам на тэлеграф.

Увайшлі...

Скамандавалі рукі ўгору.

... Пачалі вобыск ува ўсіх па чарзе, а тэлефаністку прымусіла т. Холадава злучыць іх са станцыяй Барадзянкі.

Звоніць яна адступаючым чырвонаармейцам—прасіла аб прысылцы дапамогі—бронецягнік. Адзін час ей звавілі белыя. Яна жартавала з імі. Пыталіся тэлефаністку: яна адказвала, што тэлефаністка зьмянілася.

Два разы налятала на нас—гаворыць т. Холадава варожная коньніца, але кулямётны агонь нашых рот прымушаў яе адступаць.

...У свой час, на жывых прыкладах разьбіралі старое, абываталькае ўяўленьне аб тым, што жанчына ня здольна быць байцом.

За стойкасьць і бодрасьць—а галоўнае за вялікую заслугу спасеньня 1-га Пензенскага полка тав. Холадава ўзнагароджана ордэнам чырвонага штандару.

Тав. Холадава — сялянка-батрачка Пензенскай акругі вёскі Залатароўка.

У 1919 годзе яна палякамі была арыштавана дзе была прыгаворана к растрэлу, але была заменена да бястэрміновай катаргі.

У 1921 годзе у жніўні месяцы яна была абменена з Польшай.

У сучасны момант тав. Холадава знаходзіцца ў г. Магілеве.

А. Лясны.

ВЫНІКІ ВАЙСКОВАЙ СПАРТАКІЯДЫ БВ Акругі.

Вайсковая спартакіяда БВ Акругі, якая адбылася з 15 да 18 ліпеня ў лягерах «Чырвонае Урочышча», дала шмат практычных вынікаў і падкрэсьліла нашы дасягненьні ў баявой падрыхтоўцы вайсковых частак нашай Беларускай акругі. Усе разьдзелы як у выносьлівасьці пераходу на 25 кілёмэтраў, так і ў паражэньні мішэняй, па ўзаемнай выручцы ў трудных абставінах, а таксама і па штурму ўзмоцненага палявога вайсковага гарадка паказалі добрыя посьпехі, адстаючы адзін ад другога на некалькі хвілін у час пераходу, на некалькі прабоін меней па меткасьці агню і некалькі хвілін па штурму гарадка.

Зараз перад вайсковымі часткамі і арганізацыямі ТДА-Авіяхіму неабходна стала праверыць вынікі акруговай спартакіяды і добрыя бакі скарыстаць у сваёй дальнейшай працы, што будзе адбівацца на нашай падрыхтоўцы абароназдольнасьці краіны. А цікавага і карыснага многа чаго ёсьць.

Калі мы паставім перад сабою такое пытаньне—чаму зборны разьдзел з палка пераменьнікаў заняў па паражэньню мішэняй першае месца, па штурму палявога гарадка—другое, то зразу відаць вялікая праца, праведзеная кампалітскладам у часы дапрызыўнай і міжзборавай падрыхтоўкі. Праўда, тут добрая колькасьць заслугі і грамадзкіх арганізацый ТДА-Авіяхіму. І яны значна дапамаглі ў набыцьці практыкі меткіх байцоў. Праводзячы заняткі гурткоў, стрэльбу шрацінкай мы дасягнулі таго, што малады чырвонаармеец, прыходзячы ў армію, не баіцца зброі, ведае як ёю карыстацца з першага дня вучобы. Гэта ёсьць значная дапамога, як аб гэтым падкрэсьлівае камандзір дывізіі т. Лакціёнаў. Праўда, што гэта справа не ўва ўсіх гурткох вайсковых ведаў.

Калі мы маем добрыя посьпехі ў меткасьці агню і знаньні зброі, то другі бок закінуты. Гэта-ж спартакіяда паказала, што пераменьнік падта няўмела ходзіць у супрацьгазьніках. Пасьля кілёмэтравага пераходу ў супрацьгазьніках зразу павалілася на зямлю 6 чалавек. Гэта сьведчыць, што нябыло трэніроўкі паходаў у супрацьгазьніках.

Далей, другі недахоп—гэты-ж разьдзел пераменьнікаў паказаў, што ніколькі не распрацавана рука на меткасьць кіданьня гранаты ў акоп, што ў далейшым неабходна як мага шырэй практыкаваць. У баю вялікую ролю мае граната.

Трэці недахоп—ня ўменьне перасканваць праз плот і канавы, наогул трудна даюцца ўсе тыя перашкоды, дзе патрабуецца лоўкасьць.

Вось на гэты-то бок грамадзкім арганізацыям ТДА-Авіяхіму неабходна зьвярнуць належную ўвагу. Трэба адзначыць, што гэта куды ляпей можа зацікавіць селянскую моладзь, калі замест якога небудзь цюцюня па вуліцы вёскі будзе хадзіць стройны хлапец.

Нам патрэбны для арміі—моцная загартаванасьць, спрытныя байцы. А іх падрыхтаваць такімі павінны гурткі вайсковых ведаў і грамадзкія арганізацыі ТДА-Авіяхіму. Калі і з гэтым справіцца наша арганізацыя ТДА-Авіяхіму, то яна поўнасьцю апраўдае тую задачу, якая ўскладаецца на яе нашай грамадзкасьцю.

Вайскор.

ВЯЛІКІ КАМСАМОЛЬСКІ ПАХОД

Апошнія вайсковыя паходы Менскай камсамольскай арганізацыі далі вялікія практычныя вынікі ў справе баявой гатоўнасьці камсамолу і рабочай моладзі. Зараз Менская арганізацыя ЛКСМБ чынна рыхтуецца да наступнага баявога камсамольскага паходу, які адбудзецца 21-22 ліпеня. Акрамя камсамольцаў, у паходзе прымуць удзел Менскія арганізацыі ТДА-Авіяхіму і рабочая моладзь.

Гэты паход набывае вялікае значэньне і зробіць экзамен камсамольскай арганізацыі і ТДА-Авіяхіму, ён выявіць, наколькі яны рыхтуюць і замацоўваюць баявую гатоўнасьць, а таксама будзе выяўлена становішча ваенізацыі ў камсаноле.

Выхад у паход адбудзецца заўтра а 5 гадзіне ўвечары; у паходзе прыме ўдзел 5-6 тысяч чалавек. Да паходу ўжо зроблена значная падрыхтоўка, галоўным чынам, па падбору камандзіраў, палітрукаў і г. д.

Апрача таго, што паход падагуліць зімовую вайсковую працу камсамолу і выявіць становішча ваенізацыі, паход таксама будзе скарыстан для правядзеньня «Тыдню Абароны» ў вёсцы пад знакам шырокай папулярызацыі значэньня ваенізацыі насельніцтва. З.

Падводзім вынікі за год.

(Віцебскі завод «Чырвоны мэталіст».

На заводзе «Чырвоны мэталіст» ячэйка ТДА-Авіяхіму рабіць праверку сваёй працы за апошні год.

Што-ж зроблена ячэйкай?

К «Тыдню Абароны ячэйка ў сваёй арганізацыі налічвае 450 сяброў, якія сумленна і з вялікай зацікаўленасьцю вывучаюць вайскавую справу. У працу ячэйкі ўцягнута 25 таварышоў начскладу запасу, якія актыўна працуюць у бюро ячэйкі і розных гурткох.

Пры ячэйцы існуе чатыры гурткі вайсковых ведаў. Гэтымі гурткамі ахоплена 120 чалавек, з іх 4 жанчыны. Ёсьць пры ячэйцы і хімічная команда ў 60 чалавек. Гурткі рэгулярна праводзілі свае заняткі і ўжо скончылі намечаную праграму, а ў час «Тыдню абароны» будзе наладжаны выпуск з тым, каб зноў гурткамі ахапіць новых таварышоў.

Ёсьць пры нашай ячэйцы цір, 6 стрэльбаў і інш. прылады. Наогул ячэйка забясьпечана ўсімі прыладамі для вывучэньня вайсковай справы.

Ячэйка ТДА-Авіяхіму не застанаўліваецца на маючыхся дасягненьнях, а імкнецца яшчэ шырэй разгарнуць сваю працу. Вядзецца падрыхтоўка да стралковых спаборніцтваў паміж сваімі гурткамі. Рыхтуемся мы і да выхаду ў поле для правядзеньня тактычных заняткаў сумесна з ячэйкай станцыі МББ, што зьвяцца іспытам усваеньня пройдзенай праграмы.

Ня так даўна ячэйка наладзіла спэктакль і выручыла ад яго 140 р. Гэтыя грошы пойдуць на абсталаваньне вайсковага кутка. У час «Тыдню абароны» зробілі яшчэ дзьве настаноўкі. Зараз сярод рабочых вядзецца збор грошай па падпісному лісту і трэба сказаць рабочыя ахватна адгукнуліся на заклік ячэйкі.

Свой.

5 год зямельнай валакіты

У ПРАЦЯГУ 5 ГОД ЦЯГНЕЦЦА ЗЯМЕЛЬНАЯ ВАЛАКІТА ПА ЎПАРАДКАВАНЬНЮ ВЁСКІ НОВАСЁЛАК.—ВАЛАКІТА ДАВЯЛА БЯДНЯЦКІЯ ГАСПАДАРКІ ДА ЎПАДКУ.

Вёска Новасёлкі пераважна бядняцкая, яна ў часе нямецкай акупацыі давала дзесяткі дабраахвотнікаў у шэрагі Чырвонай арміі, многа загінула на франтох у барацьбе за савецкую ўладу.

Вайна скончылася, усё ўціхамірылася.

Навасельцы пачалі гаманіць аб перабудове і палепшаньні сваёй гаспадаркі.

— З чаго пачынаць?

— Што рабіць?

Узяліся і пачалі з самага галоўнага—зямляўпарадкаваньня.

У 1923 годзе Навасельцы ўзьнімаюць перад зямельнымі органамі хадайнічаньне аб зямляўпарадкаваньні іх вёскі.

Хадайнічалі 2 гады, але, урэшце, у 1925 годзе навасельцам удалося заключыць дагавор з быўшым Барысаўскім АкрЗА.

— Ну, і далося нам гэта зямляўпарадкаваньне: сколькі пар лапцей стапталі, сколькі было гамонкі, папер, парогі пазьбівалі...

Так часам пасьля працы, сабраўшыся, гаманілі навасельцы.

Многа пагаравалі навасельцы, але, урэшце, дабіліся свайго і былі ўпэўнены, што ў іх (у 1925 г.) будзе праводзіцца зямляўпарадкаваньне. Нават б. Барысаўскі АВК і АкрЗА няраз абяцалі пачаць зямляўпарадкаваньне ў тэрмін.

— Пажывём, убачым,—сказалі навасельцы.

І вось пражылі 1925, 1926, 1927 г., ужо надыходзе 1928 г., а пра зямляўпарадкаваньне ні слуху, ні духу.

У канцы 1927 і ў пачатку 1928 г. навасельцы пачалі даходзіць парадку.

У зямельнай частцы райвыканкому т. Алай (загадчык) гаварыў сялянам так: «будуць грошы, будзе і зямляўпарадкаваньне». Акрамя гэтага, тав. Алай трэбаваў ад сялян уняслеьня 60 проц. сумы за зямляўпарадкаваньне, у той час, **як па закону павінна ўносіцца толькі 30 проц.** (да пачатку працы).

Навасельцы пачалі часаць патыліцы... дзеж-гэта адразу ўзяць столькі грошай. Пачалі зьбіраць грошы, але нічога ня вышла. Заможнікі некаторыя нават і тыя сабралі грошы, а пасьля разабралі іх назад. Большая частка сялян меркавала так: «зьбяры грошы, аддай, і грошы прападуць і зямляўпарадкаваньне ня будзе; няхай яны вышлюць каморніка, тады будзем зьбіраць грошы».

Загадчык земчасткі РВК т. Алай прыязджаючы ў вёску Новасёлкі гаварыў і раіўся аб зямляўпарадкаваньні з заможнай часткай вёскі, зусім не арганізаваў беднаты.

Аднойчы, калі бедната, якая жадала ўнесьці грошы за сябе, т. Алай сказаў так: «трэба ўнесьці за ўсіх, у тым ліку і за нежадаючых зямляўпарадкавацца, бо інакш нельга пачаць працу».

Выходзіць так, што **зямляўпарадкоўвацца не жадае заможная частка, за якую бедната павінна ўносіць грошы.**

Сяляне бачаць, што ніякага толку і парадку няма, яны склікалі агульны сход (24 сакавіка г. г.), на якім заслухалі інфармацыю старшыні сельсавету т. Казлова аб зямляўпарадкаваньні.

Заслухаўшы інфармацыю Казлова, сяляне вынесьлі пастанову, у канцы якой гаворыцца так:

Ня гледзячы на наша хадайнічаньне і на вострую патрэбнасьць у зямляўпарадкаваньні ў нашай весцы, уёй-ж зямляўпарадкаваньне не праводзіцца ў працягу пяці год. ...Зрубы будынкаў гніюць, будынкі бурацца і не рамантуюцца, дзякуючы валаніце. А пагэтаму просім увесьці в. Навасёлкі ў план па зямляўпарадкаваньню ў 1928 годзе.

Апрача гэтай пастановы сяляне папрасілі старшыню сельсавету Казлова, каб ён дапамог у гэтай справе, і ў першую чаргу дастаў-бы крэдыт.

Старшыня сельсавету Казлоў зьвярнуўся ў крэдытнае т-ва «Дапамога», дзе для вёскі Новасёлак згадзіліся даць 1100 руб. крэдыту.

Тады сяляне выбралі двух упаўнаважаных, далі ім усе дакуманты і накіравалі іх у т-ва «Дапамога». У т-ве „Дапамога" ім сказалі—прыдзеце праз тыдзень. У другі раз пайшлі,—зноў сказалі прыдзеце праз тыдзень.

Тыдні ішлі адзін за другім, і многа іх прайшло, а грошай не давалі.

Такім прыблізна парадкам хадзілі і ў РВК.

Урэшце, навасельцы пасылаюць хадакоў у Менск. Хадакі зьвярнуліся ў прыёмную ЦВК БССР, дзе выслухалі скаргі сялян, і далі загад пракуратуры рэспублікі--расьсьледаваць справу і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Пры абсьледаваньні ўсе факты пацьвердзіліся, а на загадчыка земчасткі Алая заведзена судовая справа за злачынныя адносіны да службовых абавязкаў, у выніку чаго стварылася цеганіна ў зямляўпарадкаваньні в. Новасёлкі.

Зямляўпарадкаваньне, якое было РВК пераведзена на 1929 год, Менскім акрвыканкомам уключана ў плян г.г., і ўжо пачало праводзіцца.

З. Таганскі.

АКРЗЕМКАМІСІЯ АБАРАНЯЕ КУЛАКОЎ.

У вёсцы Малая Крывіна, Бешанковіцкага райёну, Віцебскай акругі жыве кулак Клім Курносы, які да гэтае пары карыстаецца 50 дзес. зямлі. Між тым у вёсцы ёсьць сяляне, якія маюць па дзьве з палов. і па 3 дз.

Як ні стараліся сяляне, каб зрабіць абрэзку зямлі ў Курносага, нічога не дабіліся і хадайніцтва іх, абышоўшы належныя ўстановы, і зараз ляжыць у сельсавеце.

У 1925 годзе была праведзена ў в. Малая Крывіна падрыхтоўка да зямляўпарадкаваньня. Праэкт падрыхтоўкі быў зацьверджан у РЗК, АЗК і АКВК і сяляне спадзяваліся, што, урэшце, і яны атрымаюць зямлю. Але так ня выйшла. Яшчэ да правядзеньня зямляўпарадкаваньня Курносы адзяліў свайго сына і падзел гэты па прананове АЗК Бешанковіцкая РЗК зацьвердзіла.

У 1927 годзе ўсё-ж было праведзена зямляўпарадкаваньне вёскі Малая Крывіна і лішкі зямлі кулака Курносага былі разьмяркованы паміж малазямельнымі. Праэкт зямляўпарадкаваньня быў зацьверджан Бешанковіцкай РЗК.

Але Курносы з гэтай пастановай, а таксама і яго адзеленыя сыны не згадзіліся і справу абскардзілі ў Віцебскую РЗК, якая пастановай сваёй ад 25 красавіка г. г. пастанову РЗК ад 20 сакавіка г. г. і зямляўпарадкаўчы праэкт адмяніла на тэй падставе, што кулакам (як і ўсім грамадянам вёскі) далі дрэнную зямлю на абшыбах, дзе яны ніколі не карысталіся.

Таксама акрземкамісія знайшла, што прыгавар няправільна складзен, бо ў ім няма належнай колькасьці ўдзельнікаў зямляўпарадкаваньня. А пры зацьверджаньні падрыхтоўчага праэкту АЗК гэтага не гаварыла. На справе-ж прыгавар правільны, але гэта АЗК не датычыцца, бо яе не абходзіць тое, што будуць яшчэ працаваць каморнікі, падымецца пісаніна і будуць і далей мучыцца сяляне на 2-3 дзес.

А кулак у гэты час частку зямлі здае ў арэнду бяз усякай умовы, а ў сяляні, падрыхтованыя ца пераносу, будынкі гніюць і некаторыя за недахватам зямлі галадаюць.

Праўда, сяляне вёскі яшчэ 17 мая і 22 мая паслалі дзьве скаргі ў АКВК, але справа і па гэты час ляжыць у АЗК бяз руху.

Блізкі.

Дзеньнік т. Дзяржынскага ў часе яго зьняволеньня ў Варшаўскай цытадэлі.

(ДА ДРУГОЙ ГАДАВІНЫ СЬМЕРЦІ).

13 МАЯ.

Гадзіну таму назад бушавала бура Засьляляючая маланка працінала цемру, бляск яе мільгаў і, адбіваючыся ружовым колерам ад сьцен афіцыны, урываўся ў камэру. Дождж ліў, як з вядра, вецер качаў дрэвы за вакном, біўся аб сьцяну, стукаў і выў. Цяпер зацішша. Ня чутна крокаў ні варты, ні жандара-ключніка, ні сьпеву маёй суседкі, ні звону кайданаў. Толькі час-ад-часу падае на бляху пры акне дажджавая кропля, і чуецца сьвіст цягніка. Нейкі сум забіраецца ў душу. Сум—не зьняволенага. І там, на волі, ён зьнянацку падбіраўся і аўладаў мною. Гэта сум жыцьця, сум аб чымсьці нявыразным, але неабходным для жыцьця, як паветра.

Сёньня закавалі двух. Іх вялі з кузьні міма нашых вокнаў. Мая суседка, Ганка, крычала кожнаму з іх: «Няхай жыве рэвалюцыя».

Узрадаваныя, яны адказвалі тым-жа выгукам.

Як відаць, іх судзілі сёньня, можа прысудзілі да пакараньня сьмерцю. Калі я выходзіў на паветра, я заўважыў у адным з калідораў—дзе бываюць толькі прысуджаныя да пакараньня сьмерцю—часта пустым, нейкі рух. На дзьвярох адной з камэр я заўважыў вусім іржавы замок, на другой дзьверы забітую дзірку, быццам там адбывалася сьмяротная бойка з засуджаным, даведзеным да роспачы прысудам.

Надоечы я знайшоў у камэры наступны надпіс:

«Теодор Яблонский, приговоренный к смертной казни. Камера № 48 (смертная). Уже был врач. Сегодня повесят. Теперь 10 часов вечера. Прощай, жизнь! Прощайте, товарищи! Да здравствует революция!" А з боку другой рукой напісана: «Веревка заменена 10 годами каторги. Теперь у него другое дело по обвинению в убийстве провокатора. Сегодня IУ. 08 г.».

21 МАЯ.

Увечары, калі я пры сьвеце лямпы сядзеў над кнігай, я пачуў цяжкія крокі салдата. Ён падышоў да майго акна і паглядзеў праз шкло. Не падабаўся падысьці. Праз цікавасьць, або можа зацікавіўся...

— Нічога, брат, ня відаць,—сказаў я дружалюбна.

Ён не адышоў.

— Але!—адказаў ён. Уздыхнуў і, крыху пачакаўшы, спытаўся:

— Сумна вам? Зачынілі (пасьля па звычайнаму вылаяўся) і трымаюць.

Нехта увашоў на двор. Ён адышоў.

Гэтыя некалькі грубых, але спачуваючых слоў выклікалі ў мяне цалую хвалю пачуцьцяў і думак. У гэным праклятым будынку, з тых, што самы выгляд дражніць, нэрвуе і выклікае нянавісьць пачуць словы, напамінаючыя вялікую ідэю, яе жыцьцёвасьць і сувязь, нас, вязьняў, з тымі, што ў сучасны момант нас забіваюць! Якую вялізарную працу ўжо прарабіла рэвалюцыя! Яна абудзіла мозг і сэрца, дала надзею і сум і ўказала мэту. Гэтага ніякая сіла ня зможа вырваць. І калі мы ў сучасны момант, бачучы, як расьце зло, з якім цынізмам з-за нявартай пажывы людзі забіваюць людзей, часамі бярэ роспач, што гэта страшная памылка... Мы ў гэтых выпадках ня бачым далей свайго носа, не ўяўляем сабе гэтага працэсу ўвасакрашэньня людзей з мертвых. Японская вайна выявіла ўвесь жах дэзарганізацыі і распаду расейскай арміі, а рэвалюцыя толькі выкрыла зло, якое разьяднае грамаду. І гэтае зло, перш як загінуць, іменна для таго, каб загінуць, павінна было выявіцца, павінна было атрымаць перавагу над усім і гэтым давесьці сябе да банкрутства. І гэта будзе. Для таго, каб паскорыць гэты момант, неабходна перадаць масам гэту нашу ўпэўненасьць у банкруцтве, але для таго, каб імі не аўладала сумненьне і яны перажылі гэты момант у стройных і гатовых да бойкі шэрагах, гэта задача «тэарэтыкаў». А задача другіх—выявіць гэтае зло, выкрыць мукі мас і асобных вырваных з іх асяродку асоб і надаць масам тое значэньне, якое яны ў сапраўднасьці маюць і якое дае сілу адважна перанесьці ўсё бяз хістаньня і гэтым натхніць масы да адважнасьці і маральнага ўяўленьня неабходнасьці барацьбы. Неабходны тыя, што прыдаюць упэўненасьць, як і тыя, што гэтую ўпэўненасьць улізаюць у душы і сэрцы.

23 МАЯ.

Сёньня мяне першы раз наведалі жонка брата з маленькай Вандзяй. Дзяўчынка гуляла з дроставай сеткай, паказвала мне мячык і клікала: „Дядзька, выходзь"! Я вельмі рад што іх убачыў; я іх вельмі люблю. Яна прынесла мне кветкі, якія зараз красуюцца на маім стале. Яна радавалася, што я добра выглядаю, а я ўпэўняў яе, што мне вельмі добра і весела; я ёй казаў, што, мабыць, мяне пашлюць на катаргу.

Сёньня я меў спатканьне два разы (быў абаронца і сваякі) і кожны раз праходзіў па калідоры для прысуджаных на сьмерць. Там сядзяць, здаецца двое. Я бачыў, як прыслужваючы салдат нёс абед для двух. Я не сумняваюся, што гэта прысуджаныя, бо, апроч жандара, дзяжурыць у калідоры салдат з вінтоўкаю. А адтуль, з волі, пасылаюць такія дарагія для мяне прывітаньні, якія сьведчаць, што мяне не забылі, што таварышы ідуць наперад, ня гледзячы на ярмо жыцьця, і робяць сваю справу. Я бачу многіх з іх. Адны — у такім-жа становішчы як я, другія — яшчэ жывы, іншыя далёка, але сэрцам, думкай і ўсёй працай зьвернуты сюды. Яны абкружаюць шчасьцем і арэолам нашае жыцьцё, падтрымліваюць у нас сілу, энэргію і цярплівасьць.

3 ЛІПЕНЯ.

Сёньня, пасьля абеду, у мяне ў камэры адчынілі ўсё вакно. Я змагу цяпер адчыняць яго штодзень ад 4 да 5 гадзін, калі прагулкі ўжо канчаюцца і раніцою да 8 гадзін. Цяпер я ўжо ўбачу зеляніну, вялікі кавалак неба, удыхаю ў сябе сьвежае паветра. Я доўга стаяў каля вакна, абапіраючыся аб краты. Сьвежае паветра ап'яніла мяне, і зрабілася сумна. Успаміны, сум... І я адчуваю сябе ў палоне. Мяне трымаюць у зьняволеньні тут, у самой Варшаве—тут іх крэпасьць—адгэтуль яны пануюць. Нейкі калмык-салдат ходзіць са стрэльбаю і назірае, пільна сочыць за мною. А дзесь недалёка сьвішча цягнік, ляціць поезд, едуць у ім—вольныя людзі—іх многа, многа,—а нас тут жменька. І зноў бадзёрасьць агортвае мяне, хоць і сумна мне аднаму тут, у гэтай камэры, у гэтым доме.

29 ЛІПЕНЯ.

Сёньня зачынілі вокны ва ўсіх камэрах і назаўсёды іх забілі наглуха цьвікамі. Цяпер камэра зноў, як магіла. Ня відаць ні неба, ні дрэваў, ні ластавак. У нас аднялі нават сьвежае паветра. Гавораць, што вокны зачынілі таму, што зьняволеныя перапісваліся адзін з другім, апускаючы лісты на вяроўках праз вакно. Гавораць таксама, што назначан новы загадчык (нядаўна ўжо адзін зьмяніўся) і што ён адмовіўся прыняць павільён, калі вокны будуць адчынены. Учора яшчэ дазвалялі адчыняць вокны, сёньня іх забілі цьвікамі...

... Сёньня цяжка. Многія думаюць аб пратасьце, аб барацьбе, справа нават можа дайсьці да стычак, але ўсё гэта не дапаможа; вокны застануцца закалочанымі.

12 ЛІСТАПАДА.

Тры дні (7, 8 і 9 лістапада) адбываўся суд нада мною і над маімі таварышамі. Тры дні ў мяне была вялікая забава.

Справа разглядалася ў судовай палаце. Мяне везьлі туды на звошчыку і ў наручніках... Я быў узбуджан і здаволен, што бачу вулічны рух, твары вольных людзей, шыльды і абвесткі, трамваі. А потым сустрэча з таварышамі. Заля судовых пасяджэньняў... Вялікія вокны... Пакой абсталяваны пасудоваму. І, нарэшце, самы суд, у складзе 7 чалавек... Пракурор, экспэрты, поп і ксёндз, сьведкі абаронцы, блізкія сваякі. А потым: прысяга сьведак, экспэртаў і перакладчыка, паказаньні сьведак і прамова пракурора, вымагаўшага вышэйшага пакараньня па 2 ч. § 126. Потым прамова Ротштадта, які сам сябе бараніў, і прамовы абаронцаў. Нарэшце, пасьля больш, чымсь гадзіннае нарады, абвяшчэньне прысуду. Прысудзілі нас: мяне—на пасяленьне, Ротштадта і Аусэма (Сьвентаслаўскага) да 4 гадоў катаргі і Ляндау на падставе § 127—да году крэпасьці. Толькі я адзін атрымаў пасяленьне, як відаць, таму, што па другой справе, аб якой суду было вядома, змогуць прысудзіць да катаргі. Гавораць, што жандары ўжо падрыхтоўваюць трэцюю справу аба мне. Цяпер у судовай палаце ўсе справы сацыял-дэмакратаў будуць падведзены пад § 102.

Сёньня я зноў адзін у сваёй камэры. Я не ашукоўваю сябе—катаргі мне ня ўхіліцца. Ці вытрымаю я. Калі я начынаю думаць, што столькі, столькі дзён мне прадстаіць правесьці за турэмнымі кратамі, дзень за днём, гадзіну за гадзінай, як відаць тут, у X павільёне, мяне ахапляе трывога, і з грудзей вырываецца крык:—не магу. І тым ня менш **я змагу, павінен змагчы**, калі можа столькі іншых пераносяць куды горшыя пакуты. Думка адмаўляецца разумець, як гэта магчыма, ведае толькі, што магчыма, і бунт сьціхне. Заміраешся з гэтым і горда вырашыш: **змагчы, вытрымаць.** Гарачая смага жыцьця хаваецца недзе ў глыбіні і знадворнага выгляду ўсё здаецца вусім спакойным. А калі сіл ня хопіць, прыдзе сьмерць, якая вызваліць ад сьвядомась

Жыцьцё і праца асьветніка.

Праз год--яны настаўніцы.

(Заслаўскі райён, Мен. акругі).

Студэнткі 3-га курсу Белпэдтэхнікуму, сёстры Качараўскія заміж таго, каб дапамагчы наладзіць мясцовым арганізацыям грамадзкаю працу сярод селянства, цалкам падрываюць яе.

У дзень рэлігійнага сьвята «Дзевятніка», гэтыя самыя студэнткі, разам з папом арганізавалі працесію, у часе якой, будучы заправілами, насілі харугві і раздзіралі глоткі, сьпяваючы «айчэнаш» і інш. Убачыўшы энэргічны ўдзел студэнтак, вясковая адсталая моладзь, асабліва дзяўчаты, пацягнуліся за працесіяй.

Царамонія гэта цягнулася з раньня да гадзін чатырох. Высьвенчавалі сялянскія палі. Сёстры Качараўскія таксама ня мінулі свае сядзьбы. Па сацыяльнаму становішчу, яны хоць і ня вельмі заможныя, але самі ямлі не апрацоўваюць, а эксплёатуюць двух батракоў. Бацька Качараўскіх адначасова выконвае дзьве пасады: ліцейшчыка і царкоўнага старасты. Працуючы ў Менску ліцейшчыкам, ён як сябар саюзу, атрымоўвае ў месяц каля 200 руб., а ў сваей вёсцы, выконваючы пасаду царкоўнага старасты, мае таксама нажыву.

Праўленьню Белпэдтэхнікуму і ячэйцы КСМ на гэтакіх студэнтаў прыдзецца зьвярнуць асаблівую ўвагу, бо праз год яны будуць настаўніцамі.

Мятла.

Больш увагі райінспэктару асьветы

Былыя загадчыкі РайАНА, а цяпер райінспэктары, фактычна засталіся ў большасьці райёнаў тымі-ж членамі РВК. Адгэтуль яена, што іх нагрузка, як члена, не дае ім аніякай магчымасьці аддаць усю ўвагу выключна справе асьветы, у прыватнасьці школе. Яны ня могуць своечасова абʼехаць школы, даваць парады настаўніцтву, кіраваць мэтадычнай працай у райёне. Такім чынам, маючы ў райёне 60-80 школ, інспэктар абʼяжджае іх 20-30 проц. у працягу ўсяго нав. году. Рэштка школ застаюцца без агляду. Добра, калі ў гэткай школе будзе працаваць вопытны настаўнік, у якога часам і інспэктару можна павучыцца. Але калі ў школе будзе працаваць настаўнік малавопытны, дык ён можа завесьці школу туды, адкуль выцягнуць яе будзе цяжка. А такіх фактаў можна знайсьці многа. Вось гэта адзін бок таго недахопу, які назіраецца ў нас у працы райінспэктуры.

Далей, трэба таксама адзначыць, што побач з вельмі добрымі райінспэктарамі ёсьць значны лік іх, якія не адпавядаюць свайму прызначэньню, як інспэктары.

І сапраўды, які можа быць інспэктар сацвыху, калі ён сам ня мае належнай асьветы, ня толькі пэдагагічнай, але і агульнай. Гэта напершае.

Падругое ёсьць і такія райінспэктары, якія ня ведаюць беларускае мовы. Што можа даць карыснага такі інспэктар у беларускай вясковай школе, дзе дзеці не разумеюць парасейску, а інспэктар пабеларуску. Так і разойдуцца, адзін другога не зразумеўшы. А на канфэрэнцыі настаўнікаў пры такім інпэктары адчуваеш сябе ня як у БССР, а як на Маскоўшчыне.

Патрэцяе—ёсьць і такія інспэктары, якія маюць сталую пэдагагічную асьвету, але стаж іх зьлічаецца толькі месяцамі. А маладыя бяз стажу інспэктары не карыстаюцца аўтарытэтам сярод настаўніцтва, дый і даць яны многа ня могуць. Вось гэта другі недахоп у працы.

Ёсьць яшчэ шкат недарэчнасьцяй у працы райінспэктуры, якія нават цяжка ўлічыць, а яшчэ цяжай іх выправіць, пакуль пад шыльдай „райінспэктар“ будзе той-жа член РВК.

Здаецца, што гэтае пытаньне зьяўляецца балючым і ў другіх рэспубліках Саюзу, бо „Учит. Газ.“ прапануе па гэтаму пытаньню адчыніць шырокую дыскусію. Пытаньне гэта і нам трэба было-б перад пачаткам наступнага нав. году вырашыць абавязкова. Трэба вызьвіць твар райінспэктара канчаткова, для чаго НКА неабходна выдаць сталае палажэньне. У аснову гэтага палажэньня пажадана было-б наступнае:

Асоб, вызначаемых на пасаду райінспэктара, поўнасьцю вызваліць ад абавязкаў члена РВК.

Падбіраць людзей з належнай адукацыяй, абавязкова пэдагагічнай, ня ніжэй былой наст. сэмінарыі, ня менш як з 5-цігадовым стажам у сав. школе, выявіўшых сябе за гэты час добрымі арганізатарамі, пэдагогамі і грамадзкімі працаўнікамі.

На пасаду райінспэктара дапушчаць толькі тых асоб, якія дасканала ведаюць беларускую мову, і падняць п э н с і ю, што дасьць магчымасьць заняць гэтую пасаду лепшым настаўнікам 7-хгодак і іншым вопытным таварышам.

Вось толькі тады мы зможам сьмела гаварыць аб тым, як у нас пастаўлена школьная справа ў райёне, маючы сталыя весткі аб усіх школах, а ня частцы іх, зможам выправіць усе тыя недахопы, якія захаваліся яшчэ і да гэтага часу.

А пакуль у нас інспэктары ня ведаюць тэй мовы, на якой навучаюцца дзеці ў школах, пакуль яны будуць наведваць школу раз у 2-3 гады, пакуль яны, заносячы ў журналы аб выніках абсьледаваньня школы, самі робяць дзесяткі грубых памылак, да тых часоў справа ў нашай масавай школе на вёсцы будзе далёка нездавальняючай. Палепшыць яе можна толькі тады, калі будзе ўчынен сталы падбор райінспэктароў, адпавядаючых свайму прызначэньню, а таксама складзены і належныя ўмовы для цяжкай і адпаведнай іх працы.

П. Б.

С. Юравічы, Полацкага райёну і акр.

Школы сялянскай моладзі.

Дасягненьні школ.

У пачатку ліпеня адбылася ў Менску канфэрэнцыя працаўнікоў ШСМ.

На канфэрэнцыі зазначаны значныя дасягненьні ў працы ШСМ. ШСМ зьяўляецца праноўнай школай. Праца вучняў увязваецца з прадметамі навучаньня. Вучні робяць досьледы і атрымоўваюць навыкі ў розных галінах сельска-гаспадарчай працы. Праводзяць карысна-грамадзкую працу па вёсцы; закладаюць паказальныя вучасткі на гародах, у полі. Робяць кармушні, праводзяць паказальнае кармленьне. Чысьцяць насяўны матаʼял. Арганізуюць розныя таварыствы, арцелі. Уцягваюць сяльчан у кааперацыю. Складаюць арганізацыйныя пляны для калектываў і паасобных гаспадароў. Праводзяць розныя кампаніі. І наогул вучні ШСМ і самыя школы ўцалку маюць значны ўплыў на сельска-гаспадарчую працу акаляючых вёсак і на грамадзкае жыцьцё іх. Гэты ўплыў з кожным годам узмацняецца і праца вучняў пашыраецца, прычым праца гэта не зьяўляецца перашкодай пасьпяховаму праходжэньню прадметаў навучаньня, а наадварот—гэта праца, карысна-грамадзкая праца, зьяўляецца мэтавай устаноўкай усяго навучаньня, яна надае матэрыяльнасьць (усяго) вывучэньня паасобных прадметаў, дапамагае ўвязаць прадметы паміж сабою, зьяўляецца канкрэтнай, практычна-паказальнай базай выкладаньня, разьвівае актыўнасьць вучняў і рэвізуе іх працаздольнасьць. Асаблівыя посьпехі дасягнуты ў гэтым напрамку ў Суткоўскай школе, Гомельскай акругі, загадчык якой раблю даклад аб працы школы і вучняў. Самыя школы ўмацніліся, будынкі рамантуюцца, набудаваны новыя, і падручнікі запоўняюцца, вучэбныя габінэтамі ўзбагачаюцца; робіцца сталы падбор настаўнікаў, якія паступова дасканальна ўзьяўляюць сабе мэты ШСМ і набываюць належную практыку ў працоўных мэтадах навучаньня і працоўна-грамадзкім выхаваньні вучняў. Вось якія дасягненьні адзначыла канфэрэнцыя.

Недахопы.

Цэлы шэраг недахопаў і хібаў у працы ШСМ быў высунуты на абгаварэньне канфэрэнцыі. Адсутнічаньне рэжыму эканоміі, недастаткова клясавы адбор вучняў і недастаткова эканамічная і навучальная дапамога беднякам-вучням, слабая сувязь школы са скончыўшымі школу вучнямі, бюракратызм з боку настаўнікаў к вучням і з боку загадчыка к паасобным настаўнікам, зажым ініцыятывы паасобных настаўнікаў і вучняў, слабая распрацоўка мэтадаў навучальнай працы, неналежная сыстэмасьць практычнай сельска-гаспадарчай і грамадзкай працы вучняў, бясплатная праца вучняў у якасьці батракоў на вучастку ШСМ —вось галоўныя недахопы і хібы працы ШСМ.

Мэты і напрамак працы ШСМ.

Дакладамі т. т. Баліцкага, Рудаёва, Мавура, Башкевіча, Рывеса канчаткова ўстаноўлены і афармлены мэты і напрамак працы ШСМ.

Наркамасьветы т. Баліцкі кажа: «Я асабіста надаю ШСМ надзвычайна вялікае значэньне ў сыстэме народнай асьветы і ад свайго пункту гледжаньня ніколі не адыйду, таму што мы павінны выпрацаваць такую сыстэму асьветы, якая-б штурхала наперад гаспадарку і культуру». У ШСМ якраз прызначэнца штурхаць наперад сельскую гаспадарку. ШСМ выпусце не агранома ў, „а непасрэдных працаўнікоў, культурныхгаспадароў-калектывістых, якія-б сваім прыкладам і сваей непасрэдной працай штурхалі сельскую гаспадарку ў сацыялістычным напрамку. Дзеля гэтай мэты і вясковыя сямігодкі павінны быць паступова пераведзены ў ШСМ. Але, надаючы ШСМ сельска-гаспадарчы характар навучаньня і працы,—мы ня робім іх прафесіянальнымі школамі, не, а застаўляем іх школамі сацыяльнага выхаваньня, агульна-адукацыйнымі, працоўнымі школамі на базе сельска-гаспадарчай працы. Вучням, скончыўшым ШСМ, адчынен доступ ва ўсе школы вышэйшых ступеняў навучаньня. Розныя сацыялістыкі—настаўнікі, тэхнікі—будуць лепшымі сацыялістымі, калі будуць мець сельска-гаспадарчыя веды. Школа павінна прасоўваць вучыцца далей пралетарскі элемэнт.

Гаспадарка ШСМ цалкам і паасобныя частки яе павінны быць рэнтабельнымі,—такая ўстаноўка ўсіх дакладчыкаў. Толькі вывучэньне на прыкладах даходнасьці паасобных частак гаспадаркі і ўсёй гаспадаркі ўцалку, вывучэньне на прыкладах паступовай рацыяналізацыі і калектывізацыі сальскай гаспадаркі і можа даць культурных працаўнікоў, патрэбных для сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы павінны ізжыць той кансэрватызм, які ёсьць у нашай агранаміі: гэта пагаварыць ці напісаць шмат добрых слоў і парад і ў канцы параіць арганізавацца ў калектыў.

Нам такая праца наогул непатрэбна, а ў Ш. С. М. гэткая праца проста шкодна.

Канкрэтныя прыклады прыбытковасьці гаспадаркі, прыклады рацыяналізацыі працы, прыклады сталай калектыўнай працы і арганізацыі гэтай працы,—вось што павінна паказаць вучням Ш. С. М. і вось чаму павінна навучыць іх.

Толькі з гэткай падрыхтоўкай,—кажа тав. Баліцкі,—вучні змогуць рэалізаваць свае веды па за школай у патрэбным для нас напрамку, і Ш. С. М. дасягне мэты; ужо ёсьць дасягненьні.

Новыя працы з сельска-гаспадарчымі машынамі трэба высунуць на пазачные месца ў навучаньні. І гэта бясспрэчна, бо нам патрэбна машынная праца, а не першабытная. Фізычная праца вучняў у школе павінна быць вучэбна-паказальнай, мэтазгоднай; патрэбен вучот працы. І вядома —вучні павінны вучыцца працаваць прадумана і сыстаматычна; павінны вучыцца эканоміць час і энэргію.

Выхаваўча-культурная праца школ.

Асаблівую ўвагу зьвярнула канфэрэнцыя на выхаваўчы бок вучняў. Гэта пытаньне разглядалася Усебакова—падрэсьлены недахопы, дасягненьні і ўзят належны напрамак у далейшай працы.

Зьвернута ўвага на выхаваўча-культурную працу школ сярод насельніцтва, на выхаваньне асяродзьдзя; бо выхаваньнем вучняў без выхаваньня асяродзьдзя дасягнуць патрэбных вынікаў цяжка, а то і немагчыма.

Канфэрэнцыяй зацьверджаны навучальны плян і праграма. Курс навучаньня 4-хгадовы. Агульна-адукацыйныя прадметы ўведзены такія, якія выкладаюцца ў сямігодках у другім канцэнтры ў такім-жа прыблізна абʼёме.

Агульныя вывады.

Ш. С. М. у сыстэме асьветы пачынае занімаць сталае месца. Перад Ш. С. М. стаіць вялізарная задача на падрыхтоўцы культурных працоўных сялян-калектывістаў. Працы Ш. С. М. надаецца вялізарны размах, які і магчым толькі пры савецкім будаўніцтве. Ёсьць значныя дасягненьні. Працу ў далейшым сыстэматычна і беспрастанна неабходна палепшыць і пашырыць. Пашырыць сетку Ш. С. М.—вось галоўнейшыя вывады.

А. Качко.

Антырэлігійная прапаганда ў хаце-чытальні.

У апошнія часы ва ўсім СССР прымяняецца ажыўленьне і ўзмацненьне дзейнасьці духавенства і сэктанскіх груп. Царкоўныя саветы і сэктанскія групы даюць мажлівасьць арганізоўвацца ўсім былым людзям (кулаком, паном, гандляром і г. д.) і пад сьцягам рэлігіі і яе сродкамі рабіць уплыў на беднату і серадняку.

Як значны недахоп нашых палітʼ-асьветных устаноў гэта тое, што большая частка з іх праводзіць антырэлігійную прапаганду наскокамі, надаючы ёй кампанейскі характар, а некаторыя, дык праўду кажучы, праводзяць не вельмі слаба.

Грамадзкая думка наваколь гэтага пытаньня слабая, вясковая інтэлігенцыя і сялянскі актыў для ўзмацненьня антырэлігійнае прапаганды і яе правядзеньня скарыстоўваюцца слаба.

А між тым пасьпяховасьць у барацьбе з рэлігіяй будзе толькі тады; калі антырэлігійная прапаганда будзе праводзіцца стала, сыстэматычна, калі яна будзе зьяўляцца сыстэматычнаю часткаю пляннае працы хаты-чытальні.

Асабліва зараз, калі мы ўступілі ў паласу вялікае культурнае разьвіцьці, пытаньне барацьбы з рэлігіяй—торкаму на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца надзвычайна важным. Нашы палітʼ-асьветныя установы на вёсцы, дзе рэлігія трымаецца дзякуючы культурнай адсталасьці вёскі, маюцей павінны ўзяцца за антырэлігійную прапаганду.

Трэба падлічыць факты стану і руху рэлігійнасьці вёскі, раёну свайёй дзейнасьці. Трэба ўважліва сачыць за ўсімі зьменамі ў рэлігійным жыцьці вёскі, улічваць і скарыстоўваць іх пры правядзеньні антырэлігійнае прапаганды. Факты павялічэньня, або памяншэньня наведвальнікаў царквы, малебстваў, рэлігійных абрадаў, колькасьць сэктанскіх груп, сяброў у іх—павялічэньне, памяншэньне і г. д.—усё гэта трэба вывучаць, каб на падставе гэтых дадзеных больш правільна і пасьпяхова праводзіць антырэлігійную прапаганду.

Усю антырэлігійную прапаганду трэба ўвязваць з усімі відамі працы хаты-чытальні і асабліва з працай сельска-гаспадарчых і прыродазнаўчых гурткоў. Веды па сьветабудове і сельскай гаспадарцы будуць тым падмуркам, на якім лёгка будзе будаваць усю работу. Удзельнікі сельска-гаспадарчага і прыродазнаўчага гурткоў зьяўляюцца тым асяродкам, які павінен зрабіцца інструктарам арганізацыі пры хаценчытальні ячэйкі т-ва бязбожнікаў, а арганізацыю такіх ячэек пры хатах-чытальнях пазацыю такіх ячэек пры хатах-чытальнях неабходнай умовай пасьпяховае барацьбы з рэлігіяй. Найбольш лёгкімі формамі антырэлігійнае прапаганды на вёсцы трэба лічыць галосныя чыткі антырэлігійнае літаратуры і гутаркі. Пры гэтым трэба скарыстоўваць у першую чаргу газэту і часопісь «Бязбожнік» і як да чыткі, так і гутарак хатніку, альбо таму, хто будзе іх праводзіць, неабходна заўсёды стала падрыхтавацца.

Па галіне мастацкае працы трэба ўзмацніць настаноўку пʼес на антырэлігійныя тэмы. Бібліятэкі хат-чытальень у сваю чаргу павінны быць напоўнены папулярнаю антырэлігійнаю літаратурай, каб прасоўваць іх у гушчу насельніцтва.

Д.

На БССР.

(Ад нашых карэспадэнтаў).

На 1 міліён 296 т. руб. увозных тавараў.

Бабруйск, 19-7. Выпрацаван імпартны плян на наступны гаспадарчы год. Згодна гэтага пляну ў Бабруйшчыну мяркуецца завезьці з-за межаў тавараў на 1.296 тысяч рублёў. Выпаўненьне гэтага пляну строга разьмяркована па асобных арганізацыях.

Падрыхтоўка да сяўбы ні з месца.

Барысаў, 19-7. Усе райёны горача ўзяліся да падрыхтоўку да васеньняй сяўбы, а Барысаўскі РВК пакуль што нічога ня робіць. Да гэтага часу няма ніякага пляну, не ачышчаецца насеньне і г. д. Як відаць, РВК ня прыступіць да падрыхтоўкі да таго часу, пакуль не атрымае з цэнтру прапанову.

Надзеі кулакоў не апраўдаліся.

Барысаў. У першы час, калі ў крамах ЦРК адчуваўся недахоп мукі і хлеба, вясковае кулацтва пачало прывозіць на рынак збожжа. Бралі па 7-8 руб. за пуд. У сучасны момант Барысаў атрымлівае кожны м-ц 17 вагонаў мукі і забясьпечан хлебам у дастатковай колькасьці. Такім чынам, надзеі кулакоў падзаработаць не апраўдаліся.

Пашырэньне злучных пунктаў.

Бабруйск, 18-7. На наступны год у мэтах пашырэньня дапамогі сялянству ў калгасах акругі мяркуецца арганізаваць 8 пракатных пунктаў сельска-гаспадарчых машын і 70 злучных пунктаў. Такім чынам па акрузе ў наступным годзе будзе іспаваць 20 пракатных пунктаў і 139 злучных пунктаў.

Кватэрнае будаўніцтва ў лясьніцтвах.

Гомель, 18-7. У гэтым годзе на кватэрнае будаўніцтва ў лясьніцтвах будзе выдадзена 15970 руб. Будзе пабудаваны новы дом у Красна-Бярэскім лясьніцтве і 11 дамоў для лясное варты ў розных лясьніцтвах акругі.

Праўленьне саюзу сельска-гаспадарчых рабочых, улічваючы кватэрную патрэбу лясных працаўнікоў, узьняло хадайніцтва перад ЦП саюзу аб звароце 75 проц. фонду палепшаньня быту бягучага году на кватэрнае будаўніцтва ў лясьніцтвах.

Увоз вэлёсыпэдаў.

Бабруйск, 19-7. У наступным гаспадарчым годзе Аўтадор Бабруйшчыны мяркуе завезьці з-за граніцы 500 вэлёсыпэдаў і 2 легкавых аўтамабілі. Попыт на вэлёсыпэды зазначаецца вялікі.

Праверка—самакрытыка—кантроль мас.

Грошы пусьцілі па ветру.

Здарылася сэкратару Коханаўскага РВК т. Міхневічу гандляваць коньмі (мусіць успомніў Талочынскі РВК). Справа ладная і як жа ад яе адмовіцца! Заданьне РВК аб здабыцьці каня Коханаўскай пажардружыне т. Міхневіч выканаў на ўсе 100 проц.; купіў, кажуць добрыя людзі, каня ў нейкага свайго свата за 160 р. Прывёў ў Коханава. РВК перадаў каня пажардружыне. Апошняя зьдзівілася такой цане, але каня прыняла.

Праз тыдзень-два дружына агледзілася, што конь хворы, ледзь ногі цягае і пачала прасіць РВК, каб апошні ўзяў каня назад.

А РВК у адказ;

— Калі ваш гэты конь не падыходзіць—прадайце.

Дружына склала камісію па ацэнцы каня. Ветэрынарны фальчар прызнаў катар страўніка і каня ацанілі ў 80р.

17-га чэрвеня каня, пратрымаўшы два месяцы, прадалі за 80 руб., ды аплацілі і ўдзельніку прадажы 5 руб., бо тут, мусіць, і Міхневіч ня браўся прадаваць.

Прапалі дарэмна 85 руб., прапалі грошы па дагляду, корму і захаваліся канцы куплі ўдалай.

Ці не пацікавіцца «гандлёвымі» здольнасьцямі Міхневіча хто-небудзь, хаця-б рэвізійная камісія РВК і ці не «падзякуе» яна яго. **30.**

„Гэрой“ Чаркасаў.

У судовага выканаўцы 3-га вучастку Аршанскае акругі т. Чаркасава шмат якія выканаўчыя лісты марынуюцца па некалькі год. Так, напр., выканаўчы ліст гр. Бранзбург да Таўсташэя Х. з Талочына марынуецца ў згэты ўжо 2 з паловай гады. Бранзбург, —гэта ўдава, мужа якой забіў Таўсташэй, цяпер з сямʼёю прымушана галадаць, ня маючы ніякіх сродкаў для пражыцьця. Судовы выканаўца на запытаньне гэтае няпчаснае кабеты адказвае;

— Таўсташэй ня мае ніякае маемасьці, ёсьць толькі адзін дом, які нельга прадаць.

А тое, што Таўсташэй апрача дому мае яшчэ і гаспадарку, гэтага ён ня хоча ведаць.

Заядлы судовы выканаўца спакойна адказвае Бранзбург:

— Падайце на мяне пракурору. Як відаць, і пракурора ён не баіцца.

А сколькі такіх, як Бранзбург? Іх дзесяткі, сотні, выканаўчыя лісты якіх спакойна адпачываюць. Даволі ўжо зазначыць на тое, што кожны дзень да сьледчага Цухая паступаюць скаргі на судовага выканаўцу, што гавораць пра шматлікія агіднасьці, якія там учыняюцца. А што-ж можа зрабіць сьледчы, калі судовы выканаўца ня хоча нават даваць яму тлумачэньняў на тую ці іншую скаргу, а калі абяцае выехаць на месца для праверкі, дык справа так і застаецца і да сьледчага зноў скарга паступае. Так судовы выканаўца Чаркасаў водзіць за нос і сьледчага, на якога ён злы і ўжо некалькі разоў скардзіўся пракурору.

«Адзін раз, апавядае Цухай, прышлося распачаць цэлую перапіску з-за выканаўчага ліста, які быў перададзен судоваму выканаўцу і потым згубіўся; знайшлі яго нават не запісаным у журнал для ўваходзячых паперы».

Судовы выканаўца вельмі груба адносіцца да грамадзян: «Сволач», «Дура»—вось яго словы, якія часта чуюць ад яго. Быў такі выпадак, калі гэты заўзяты судовы выканаўца аднэй старой кабеце адказаў:

„Ідзі таміся, усё роўна грошай ад сваіх сыноў не атрымаеш».

І калі сьледчы Цухай, які прысутнічаў пры гэтым, заявіў пракурору, дык той нават не зьвярнуў на гэта ніякае ўвагі.

Яшчэ вельмі цікава тое, што калі прыяжджаў рэвізор з акруговага суду правяраць працу судовага выканаўцы, дык ён нічога гэтага не заўважыў. Гавораць, што судовы выканаўца Чаркасаў з «бывшых» царскіх, што ён часта пʼе.

Мы патрабуем тэрміновага ўмяшаньня пракуратуры дасьледаваньня справы.

Селькор № 1.

Тураўскія эскулапы.

Тураўская больніца не перамянілася ад старых часоў як знадворнага боку, гэтак і па сваёй унутранай арганізацыі. Той-жа бюракратызм, таяʼ-ж валакіта. Прычына гэтага—зразумела працаўнікі больніцы, люкзі са старымі поглядамі і традыцыямі. Прыяжджаючыя ў больніцу сляпе прымушаны сядзець на пяць-шэсьць гадзін, чакаць, калі іх выклічуць. Селяніна навіном траціць цэлыя працоўныя дні на тое, каб дабіцца ад лекара адказу. А калі вышаўшы з пяроньня селяніна адчыніць дзьверы ды пашытае фэльчара, чаму гэтак доўга прыходзіцца чакаць хворым, той строга адказа:

— Гэта ня ваша справа.

А ён спакойна сядзіць сабе ды робіць нейкія квіткі, якія ніякай адносіны ня маюць да агляду хворых. Квіткі, адсутнасьць усякай сурʼёзнасьці ў адносінах лекароў да хворых. Прыходзіць чалавек на медыцынскі агляд,—зразумела, ен хоча, каб пры гэтым нікога ня было. А тут у амбуляторыі цэлая хэўра сябраў фэльчара. Хворы зьяўляецца для іх забавай. Усе яго абкружаюць, аглядваюць, мацаюць, што вельмі няпрыемна хвораму.

Наогул, няма ніякай зацікаўленасьці лекароў у тым, каб правільна вылініць хваробу, даць дапамогу хвораму.

Прыходзіць вучань да фэльчара на агляд яго здароўя, і хоча атрымаць спраўку. Але апошняй яму ве даюць, прызнаючы яго хворым. Праз тыдзень той-самы вучань ідзе зноў на агляд, яго пазнаюць.

— Але, кажуць, мы цябе вельмі, ты хворы. Намалюй нам лёзунг, выдамо спраўку.

Гэтак, скарыстаўшы момант, калі фэльчару трэба было намалёваць лёзунг, вучань атрымаў спраўку.

Можна прывесьці яшчэ шмат фактаў аб нашай больніцы, але думаю, і гэтых хопіць, каб чытач уявіў сабе нашу больніцу.

Камсамолец П. Ж.

„Мастакі“ з ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва.

Яшчэ ў лютым 1927 г. гр-н Каганоўскі падаў заяву ў ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва аб дапамозе спагнаць належачую яму выхадную дапамогу ад Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру.

Падаў і чакае. Чакае месяц, другі. А ад ЦП ні прыказу, ні адказу.

Падае гр-н Каганоўскі заяву ў ЦП саюзу працаўнікоў мастацтва (жыве Каганоўскі ў Маскве).

ЦК піша ў ЦП Беларусі раз, піша другі раз.

Нарэшце чыноўнікі з ЦП пішуць адказ, што спагнаць грошай ня могуць, бо, бачыце, кіраўнік тэатру Рафальскі ў працяжным адпуску.

Бедныя чыноўнікі! Ну а што, каб Рафальскі зусім не вярнуўся, або, барані божа, памёр, што-б вы тады рабілі?

Перапіска ідзе далей—ЦК піша ЦП, Каганоўскі і ў ЦК і ў ЦП разам.

Адным словам пішуць,--не дарма мастакі.

Праз год, ужо ў лютым 1928 году, ЦП запрашвае ў Каганоўскага спраўку аб яго працы ў яўтэатры, для перадачы справы ў працесію.

Паслаў. Зноў чакае, месяц, другі...

Маўчаць.

Нядаўна Каганоўскі даведаўся, што працесія вырашыла справу яшчэ ў маі м-цы г. г. на яго карысьць.

Жыве Каганоўскі ў Маскве, сядзіць бяз працы і ў дадатак хварэе. Прыехаць самому ў Менск няма магчымасьці. І вось піша ён 16 мая заяву ў ЦП, дзе просіць спагнаць грошы па выканаўчаму лісту і перасласць яму.

Паехаў. Зноў чакае, чакае месяц, другі падыходзіць к канцу...

Ну, а ЦП?

Маўчыць, як і раней.

А справа цягнецца паўтара гады і калі яна будзе вырашана—невядома.

Чаму патураюць эксплёататару.

Недалёка ад Барысава знаходзіцца хутар Макаўе, дзе гаспадарыць гр-н Элькінд. Ён мае 19 дз. зямлі, трох коняй, 5 кароў і шмат іншай дробнай жывёлы.

Сам Элькінд на хутары ніколі ня жыве, ён наймае сялян і батракоў для працы на гаспадарцы.

Элькінд мае трох сыноў. Адзін з іх мае ўласную лесапілку і млын у Прыяміне. Другі арандуе млын у Халопеніцкім райёне, і трэці працуе ў Маскве прыватным камэрсантам. Усе яго сыны ў працягу 8-40 гадоў ня жывуць пры ім, ён таксама жыве ў Прыяміне ў свайго сына. Па вучоту абʼектаў у яго было ўключана 14 едакоў, гэта значыць усё пакаленьне «жывое і мёртвое». У 27 годзе райённая падатковая камісія па заметцы вымешчанай у газэце «Савецкая Беларусь» № 91 зрабіла абсьледваньне гаспадаркі Элькінда. У выніках 13 едакоў было выключана, а застаўлен толькі сам Элькінд, на якога быў накладзен падатак у 110 руб. Гэта пастанова РЗК гыла зацьверджана Акр. падкамісіяй. Але гэтым кулак Элькінд не здаволіўся, ён падаў скаргу ў НКФ. Апошні прапанаваў перагледзіць усю справу. АПК перагледзіла справу і выключыла з 13 едакоў толькі 6, ня ўказаўшы каго, таксама паменшыла падатак.

Цікава ведаць, чым кіравалася АПК, калі з выключаных раней 13 едакоў заставіла на гаспадарцы 8 чал.

У 27 г. Барысаўская РЗК, грунтуючыся на тым, што Элькінд і яго сыны кулакі, якія ў працягу некалькіх гадоў не апрацоўваюць самі зямлі, а трымаюць батрака і батрачку, а ў летні час эксплёатуюць сялян, узьняла пытаньне перад АЗК аб залічэньні зямлі Элькінда ў запасны фонд. Такой пастановай Элькінд не здаволіўся, падаў скаргу ў АКВК. Апошняя выносіць пастанову па-свойму.

«Пры разглядзе гэтай справы, трэба мець на ўвазе, што палітыка савецкай улады кіруецца ў бок надзяленьня ўгрэяў зямлёй, а не адабраньня ад іх зямлі, і часовас зьявішча, што Элькінд ня жыве стала на хутары Макоўе з прычыны 4 разовага рабаваньня яго бандытамі—яшчэ ня выключае неабходнасьці пазбаўленьня яго зямлі, пагэтаму хадайнічаньне Барысаўскай РЗК аб адняцьці зямлі ад уласьніка Элькінда АКВКадхіліла“.

Тут цікава ведаць, паважаныя таварышы з АКВК, адкуль вы ўзялі, што Элькінда чатыры разы абрабавалі бандыты? Бо мы, тутэйшыя, добра ведаем што ў працягу апошніх 8 гадоў такіх выпадкаў у райёне зусім ня было.

Цяпер паглядзім, ці ёсьць такія законы савецкай улады, якія кажуць надзяляць прыватніка зямлёй, які сумеснна з сынамі трымае лесапілку, млын і г. д., а зямлю абрабляе чужымі рукамі, эксплёатуючы беднату. Мы ведаем, таварышы з АКВК, што палітыка нашай савецкай улады кіруецца ў бок надзяленьня зямлёй працоўнай яўрэйскай беднаты, якая сама будзе працаваць на зямлі. Пагэтаму, зямля ад эксплёататара Элькінда павінна быць аднята

Ал. Станкевіч.

НАТАТКІ ПРА УКРАІНУ.*)

Дзьве гадзіны язды на маторнай лодцы ўверх па Дняпру і вы апыняецеся сярод прыгожага букавага гаю, у Міжгорʼі. Маляўнічыя, высачэзныя берагі з багатай расьліннасьцю, з рознакаляровымі аголенымі ад расьліннасьці кручамі ўздоўж Дняпра робяць на вас уражанне сваёй веліччу...

Сярод гор, у нізіне, у Міжгорʼі, стаяць нібы ўкопаныя муры былога Міжгорскага кляштару. Кляштару даўным даўно няма, а заместа яго ў белых, старасьвецкіх мурох зьмяшчаецца Міжгорскі Керамічны Тэхнікум.

Міжгорʼе в даўніх часоў вядома як асяродак керамічнай прамысловасьці. Багатыя на самую найрознастайную гліну нетры зямлі у Міжгорʼі. У нас на Беларусі «міжгорка»—агнятрывалая пасацка—мела і мае вялікі збыт... У Міжгорʼі маецца гліна любых колераў і адценкаў: і белая, і жоўтая, і чырвоная, і сталёва-чорная...

На працягу XIX ст. у Міжгорʼі існавала фаянсавая фабрыка, якая вырабляла рочы высокай мастацкай якасьці, але, дзякуючы няўмеламу кіраўніцтву, справа была даведзена «да ручкі», і толькі сялянства памаленьку распрацоўвала нетры, вырабляючы цэглу—«міжгорку», пакуль савецкая ўлада, пастановаю III-га ўсеукраінскага зьезду саветаў, не ўхваліла адчыніць у Міжгорʼі на месцы старой фаянсавай фабрыкі—керамічную школу-майстэрню...

З керамічна (глінаапрацовачнай) школы-майстэрні вырас Мастацка-Керамічны Тэхнікум—база керамічнага Інстытуту на Украіне.

З самага ранку, пачынаючы з сьнеданьня, і, да позьняга вечару, да вячэры, мы ўжываем самае нарознастайнае начыньне: талеркі, чашкі, сподкі, імбрычкі.

Дык вось, заданьне церад Міжгорскім Керамічным Тэхнікумам—даць майстроў, гэтага прыгожага, гэтулькі неабходнага начыньня, для фаянсавых фабрык...

Тэхнікум выпускае інжынэраў-мастакоў керамічнай прамысловасьці...

Вежліва, па-гасьціннаму, сустракае нас загадчык тэхнікуму, адзін з яго заснавальцаў і кіраўнікоў—тав. Сэдляр.

Сам садзіцца за станок і ў ягоных руках кавалак мяккай, як пух, гліны прымае самыя найрознастайныя формы... Вось вырасла вазачка, падобная на эгіпецкую урну, вось прасты глячок, вось гарнчок, жбанок, міса—і... гліна прымае панова форму звычайнага кавалку... Прадэманстраваўшы вырабы з гліны, ён знаёміць нас з фаянсавай вытворчасьцю, больш складанай на сваёй тэхніцы. Вось вазы рабы з каменнай масы, май-оліка, прыгожыя ўзоры вырабу з парцэляны—імбрычкі, сподачкі...

У кожным пакою—паасобная лябаторыя—керамічная, хэмічная, мастацкая і інш...

Дзякуем за паказ нам керамічнага музэю, складзенага з узорных, заліковых прац студэнтаў тэхнікуму, бачым новы арнамэнт на начыньні, кампазіцыю арнамэнту, а колеры пераплятаюцца так, і стваравочы прыгожыя ўзоры, аздабляючы сваёй росьпісьсю акуратненька, на чарцяжох зробленыя, сподачкі, чашкі, імбрычкі...

Радуемся за веру дырэктара ў будучыню керамічнай прамысловасьці на Украіне, у Міжгорʼі, верым, што на міжгорскай гліністай глебе вырасьце новая фаянсавая фабрыка...

———

Надворʼе спрыяе нам, і мы з высачэзных круч Дняпроўскага ўзьбярэжжа дзівімся на захад сонца...

... Гудзіць матор, і мы стралою імчымся шэрай вячэрняй парою на водах Дняпра зноў у Кіеў...

Летняй ноччу, калі зоркі асабліва ярка гараць і мігцяць, вельмі цяжка адрозьніць агні зямлі, ад зорак начнога шатру... Падʼяжджаем бліжэй да Кіева—любуемся прыгожасьцю Кіева ноччу... Міліечы агней, агоньчыкаў і ўсе яны адбіваюцца ў гладзі Дняпра нібы ў люстры,—падвайваюцца, зьліваюцца ў адзін вялізны агонь...

Заўсёды, калі пішучы ня можна адшукаць слоў для апісаньня прыгожай, захапіўшай яго мясьціны, ён кажа:

— Не хапае слоў, і ставіць тры кропкі.

У даным выпадку я выкарыстоўваю гэты спосаб...

Кіеў асабліва прыгожы ўначы, калі падʼяжджаеш да гораду з Дняпра...

Аглядаючы ў Кіеве раскошны батанічны сад, аглядаючы ў Кіеве вялічэзную карцінную галярэю, напоўненую творамі мастакоў мінулага—Семірадзкага, Паленава, Левітана, Ніверава, Сурыкава, Антакольскага, Айвазоўскага, Пэрава, Рэпіна, Шышкіна, Верашчагіна, Куінджы і інш., аглядаючы Сафійскі сабор, аглядаючы помнік XI стагодзьдзя—Міхайлаўскі манастыр,—бачым мы як усё гэта старанна захоўваецца.

———

Зьяўляючыся культурным асяродкам для

ДРУГІ КОНКУРС

Кантора газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ абвяшчае

ДРУГІ КОНКУРС

НА ЛЕПШАГА ЎПАЎНАВАЖАНАГА, ВЫЛУЧАНАГА МЯСЦКОМАМІ ЦІ ГРУПКОМАМІ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ Ў СПРАВЕ РАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ ГАЗЭТЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ».

Конкурс абвяшчаецца з 1-га жніўня і будзе цягнуцца да 31-га сьнежня г. году.

Уся прысланая ўпаўнаважанымі падпіска, пачынаючы з 1-га жніўня да 31 сьнежня, будзе залічана на конкурс. Падпіску можна зьбіраць на жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад і сьнежань месяцы г. г., а таксама і на ўвесь 1929 год.

Падпіска прымаецца ўпаўнаважанымі як за налічны разрахунак, так і ў крэдыт (крэдытная падпіска ўпаўнаважанымі праводзіцца на ранейшых умовах).

Падпіска зьбіраецца ня толькі сярод асьветнікаў, але і сярод іншага жыхарства і ўсіх установаў і арганізацый.

УМОВЫ КОНКУРСУ:

ЗА ЗБОР ПАДПІСКІ БУДУЦЬ ВЫДАНЫ ПРЭМІІ:

За 1300 экземпляраж месяцаў і больш прэмія 160 руб.

ад 1300 да 1150	—	140 руб.
ад 1150 да 1000	—	120 »
ад 1000 да 800	—	90 »
ад 800 да 600	—	75 »
ад 600 да 400	—	50 »
ад 400 да 300	—	30 руб.
ад 300 да 200	—	20 »
ад 200 да 100	—	бясплатна газэта «Савецкая Беларусь» на год.

Лік прэмій неабмежаваны. Такім чынам, большую прэмію могуць атрымаць некалькі ўпаўнаважаных.

Прэміі паступаюць на карысьць упаўнаважаных, а на карысьць мясцкому застаўляецца на месцы 15 проц. ад сумы падпіскі.

Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены 15 студзеня 1929 году.

ЛЁТАРЭЯ ДЛЯ ПАДПІСЧЫКАЎ.

Разам з гэтым абвяшчаецца для ўсіх падпісчыкаў лётарэя

15-ГА СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 50 КАШТОЎНЫХ РЭЧАЎ.

У лётарэі будуць удзельнічаць толькі індывідуальн. падпісчыкі (установы ўдзелу ня прымаюць)

Умовы ўдзельнічаньня ў розыгрышы:

Усе падпісаўшыяся пасьля 1 жніўня на 6 мес. атрымоўваюць 1 лётарэйны білет; на год—3 білеты.

Лётарэйныя білеты будуць высланы ўсім падпісчыкам пасьля таго, як будуць імі прысланы кейтлі аб здачы падпіскі, з дакладным адрасам, дзе бы яны ні падпісаліся: на пошце ці ў упаўнаважаных канторы.

У ЛЁТАРЭІ БУДУЦЬ РАЗЫГРАНЫ НАСТУПНЫЯ РЭЧЫ:

1 вэлёсыпэд
2 швейныя ножныя машыны
3 фотааппараты
2 касьцюмы
2 самавары
5 прымусаў
15 насьценных гадзіньнікаў
10 радыёпрыёмнікаў з моўным абсталяваньнем
10 камплектаў часопісі „Полымя“ на 1929 г.

У конкурсную і лётарэйную камісіі вылучаны наступныя таварышы: ад рэдакцыі—рэдактар газэты Кудзелька М., загалчык канторы Касьцюк, загадчык асьветніцкага аддзелу—Камлюк, ад ЦК саюзу працасьветы Платун і Мельнік. Апрача таго, два прадстаўнікі ад райёнаў, сабраўшых больш лік падпіскі, і прадстаўнік РСІ.

Адміністрацыйна-гасп. выдаткі павінны быць зьніжаны.

(З пленума ВСНГ БССР).

На пасяджэньні пленуму ВСНГ БССР быў абгавораны даклад аб зьніжэньні адміністрацыйна-гаспадарчых, агульнаводзкіх і гандлёвых выдаткаў па прамысловасьці ВСНГ за першае паўгодзьдзе бягучага гаспадарчага году.

З дакладу т. Лучышына відаць, што за мінулае паўгодзьдзе па прамысловасьці ВСНГ выдаткі, у параўнаньні з палавіннымі фактычнымі выдаткамі за 1926-27 год, скарочаны на 12 пр. Трэба адзначыць, што, дзякуючы несваечасоваму і недакладнаму складаньню каштарысаў, фактычнае зьніжэньне выдаткаў у некаторых трэстах і прадпрыёмствах праводзілася са значным спазьненьнем:—па некаторых у канцы першага кварталу, а па іншых трэстах нават толькі ў пачатку другога кварталу.

Некаторыя трэсты, гаспадарчыя адзінкі і паасобныя прадпрыёмствы не праявілі дастаткова увагі і настойлівасьці ў галіне правядзеньня максымальнага зьніжэньня выдаткаў. Нават маюць месца перавыдаткі па зацьверджаных каштарысах, асабліва гэта назіраецца на агульна-завадзкіх выдатках. Так, у Лесбеле мяецца перавышэньне на 6,8 проц., мэталётрэсьце—на 8,1 проц., скуртрэсьце—на 5,7 пр., вапалкавым трэсьце—на 18,9 проц., ільнопрадзільным аб'яднаньні—на 10,3 проц. і «Чырвоны хімік»—на 13,8 пр.

Гэтыя, досыць значныя, перавыдаткі супроць зацьверджаных каштарысаў сьведчаць аб тым, што бюджэтная дысцыпліна ў нашай прамысловасьці кульгае і трэба паставіць пытаньне аб узмацненьні адказнасьці за парушэньне з боку кіруючага і бугальтарскага апарату.

З недахопаў можна адзначыць і тое, што ў шэрагу выпадкаў пытаньні скарачэньня выдаткаў недастаткова ўвязваюцца з рацыяналізацыяй работы. Дзякуючы гэткаму становішчу, мела месца адсталасьць у справаздачнасьці, што вымушала наймаць лішніх працаўнікоў і наогул рабіць нерацыянальныя выдаткі сродкаў. Трэба таксама адзначыць, што амаль па ўсіх трэстах і прадпрыёмствах зьніжэньне выдаткаў мала закрапула канцэлярыю, паштова-тэлеграфныя выдаткі і камандыровачныя. І гэта ў той час, калі па заправэктаваных каштарысах зьніжэньне выдаткаў намячалася, галоўным чынам, на вышэйпаказаных разьдзелах.

Нязначнае зьніжэньне агульнагавадзкіх выдаткаў у першым паўгодзьдзі пагражае зрывам выкананьня дырэктывы па ўсёй прамысловасьці, а таму неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на правядзеньне ў жыцьцё суровай бюджэтнай дысцыпліны.

На скарачэньні выдаткаў адбіваецца таксама па некаторых трэстах і лішняя апека над прадпрыёмствамі. Гэтая непатрэбная апека выклікае частыя камандыроўкі, а з апошнімі лішнюю трату грошай і непатрэбную перапіску па дробных пытаньнях. Такое становішча ўносіць вялікую перашкоду ў справе рацыяналізацыі працы апарату і скарачэньні адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў.

У спрэчках усе выступаўшыя таварышы ўказвалі на тое, што дырэктывы аб зьніжэньні выдаткаў павінны быць выкананы па ўсе 100 проц., але праца гэта вельмі цяжкая.

Відаць яшчэ нашы гаспадаркі мала ўявілі ўсю важнасьць гэтага пытаньня, а таму і зьнізіць трэба, але цяжка.

Праэкт пастановы па дакладу аб зьніжэньні выдаткаў пленум перадаў на канчаткове зацьверджаньне прэзыдыуму ВСНГ.

Па дакладу аб кантрольных лічбах прамысловасьці пленум выдзеліў камісію, якой даручыў на падставе практычных прапаноў у спрэчках апрацаваць рэзалюцыю, якую канчаткова зацьвердзіць прэзыдыум ВСНГ.

6 гадоў працы Белдзяржгандлю.

Шэсьць гадоў таму назад у ліпені 1922 году пачала функцыянаваць у Беларусі дзяржаўная экспартна-імпартная кантора «Белдзяржгандлю».

З невялікім капіталам пры вельмі цяжкіх умовах прышлося ўзяцца за працу. У той час прыватнік быў яшчэ моцны, у руках яго было амаль усё і барацьба з ім была вельмі цяжкая, але дружная актыўная работа Белдзяржгандлю наступова, крок за крокам, завяявала рынак. Да Белдзяржгандлю ніхто не экспартаваў з БССР, рынак ня быў вывучан, ня ведалі за што ўзяцца, як пачаць, якім чынам „пробить брешь в Европу“, што экспартаваць у першую чаргу, што імпартаваць.

Спачатку экспарт Белдзяржгандлю быў вельмі нязначны, праца пасоўвалася слаба. Але замежныя рынкі вельмі хутка пачалі вдчуваць Беларускі Дзяржгандаль; апошні з кожным днём рос, з кожным кварталам расьлі ўсё новыя віды экспарту, выяўляліся розныя віды тавараў.

І на загатоўчым рынку Белдзяржгандаль стаў першым. Пасыпаліся за граніцу—ў Нямеччыну, Польшчу, Латвію, Аўстрыю і Амэрыку—вялікія партыі шчаціны, шпаніцы, конволоса, грыбоў, лёну, кудзелі і шмат іншых тавараў.

Работа развівалася в кожным днём, але экспарт усё-ж такі яшчэ не дасяг патрэбных і неабходных разьмераў, бо яшчэ шмат тавараў ня было выяўлена.

Гады ішлі, экспарт Беларусі рос не па днёх, а па гадзінах, а галоўнае ў адносінах другарадных дробных відаў тавараў.

Калі ў першыя гады свайго існаваньня Белдзяржгандаль браў курс на рэнтабельныя прадметы, як пушніна, шчаціна, лён і інш., то за апошнія гады курс быў узяты, галоўным чынам, на вывад «няпрыкметных» відаў тавару на прамтавары.

Моцна і шырока разгарнулася праца па загатоўцы садавіны, брусьніцаў, яек, грыбоў, рызьля і касьцей. І можна сьмела і з упэўненасьцю падкрэсьліць, што на 7-м годзе свайго існаваньня Белдзяржгандаль выяўляецца адзіным экспарцёрам усіх гэтых дробных і да гэтае пары заглохлых відаў тавараў.

Імпарт Белдзяржгандалю набыў вусім іншыя формы. Увозяцца амаль выключна прылады вытворчасьці—машыны, трактары, розныя тэхнічныя прылады, хэмічныя, увозяцца цэлыя абсталяваньні для правядзеньня электрыфікацыі, пабудовы заводаў і фабрык, абсталяваньні універсытэцкіх лябараторый і г. д.

Шмат няжкасьцяй прышлося перанесьці Белдзяржгандлю ў гэтыя гады. Прычына гэтага ў тым, што яшчэ вусім нядаўна многія не ўяўлялі сабе ўсю важнасьць і сур'ёзнасьць экспарту. Тут трэба сказаць, што Белдзяржгандаль сам вінават, бо ім былі ўжыты заходы, неабходныя для папулярызацыі экспарту, растлумачэньні ўсіх выгодаў ад экспарту.

Яшчэ нядаўна многія, на вялікі жаль, гляделі на Белдзяржгандаль, як на «чужаземнае» прадпрыёмства, да гэтага часу супроць Белдзяржгандлю многія выступалі. Досыць перагледзець нашу прэсу за гэты час, каб пераканацца ў тых няпрыемнасьцях, якія меў Белдзяржгандаль.

Трэба прызнаць, што шмат памылак сапраўды зрабіў і Белдзяржгандаль: не заўсёды ён выконваў дырэктывы ў адносіне захаваньня ўстаноўленых цэн на тыя ці іншыя віды сыравіны, не заўсёды метады яго загатоўчай дзейнасьці былі правільны, што ў выніку стварала нездаровую канкурэнцыю, ажыятаж і г. д.

Праўда, каапэрацыя не заўсёды дружна адгукалася на заклік Белдзяржгандлю, каапэрацыя не заўсёды ішла насустрач экспартным патрэбам, не заўсёды ішла па адной лініі з асноўным экспартэрам БССР.

Зараз на 7 годзе працы Белдзяржгандлю і каапэрацыі час зразумець, што толькі агульнымі і дружнымі сіламі ўдасца павялічыць экспарт БССР, а павялічэньне экспарту—гэта павялічэньне нашай прамысловасьці.

Пачалі з экспарту ў 200-300 тысяч, а канчаюць у 7 мільёнаў, пачалі з 5-6 прадметаў, а зараз мяецца намэнклятура ў 50-60 назваў прадметаў.

Вырасла і капітальнае будаўніцтва Белдзяржгандлю: можна спадзявацца, што ў 1929 годзе Белдзяржгандаль будзе мець свае заводы, фабрыкі і базы, што значна павялічыць экспартны баланс. *Леўскі.*

Вывучаем свой край.

Летняя праца краязнаўчых арганізацый.

Летняя праца краязнаўчых арганізацый на мясцох зараз разгарнулася ў галіне вывучэньня і дасьледаваньня зьяваў прыроды і помнікаў старасьветчыны. Праводзіцца рэгулярныя фэнэлёгічныя назіраньні. Да гэтага часу ёсьць ужо матар'ялы 100 назіраньняў. Абагуленьне ўсіх фэнэлёгічных назіраньняў у працягу некалькіх год дасьць магчымасьць устанавіць ход сэзонных зьяў у прыродзе, т.-э. можна будзе ўстанавіць характарыстыку нашага біо-клімату напрыклад, на падставе такіх назіраньняў ужо ўстаноўлена, што ў Мазырчыне збожжа пасьпявае на 2 тыдні раней, чым у Віцебшчыне, адлёт птушак у вырай у паўднёвых акругах адбываецца на тры тыдні позьней, чым у паўночных і г. д.

Вывучэньне новага быту.

Настаўнік Асіпавіцкага райёну, Бабруйскай акругі т. Немцаў вельмі дакладна апісаў в. Журавец, Ясінскага с.-с. У гэтым апісаньні паказана, як новая эканоміка і новы быт праяжаюць у беларускую вёску.

Як прыклад гэтага руху, т. Немцаў паказаў аднаго селяніна гэтае вёскі, які пачынае ўмываць новыя формы апрацоўкі зямлі. Маючы толькі 2 дз. зямлі, ён разводзіць на адной чвэрці дз. кармавыя буракі і, наогул, уводзіць у сваёй гаспадарцы ўсе парады аграномаў.

ЦБ Краязнаўства выдае апісаньне ўсяго Асіпавіцкага райёну, мястэчка Асіпавічі, 2-х сельсаветаў і в. Журавец і мяркуе распаўсюдзіць гэта выданьне, дзеля прыкладнага карыстаньня, паміж краязнаўчымі арганізацыямі, асьветнымі установамі, сельсаветамі.

Вывучэньне беларусоў Сібіры і Далёкага Ўсходу.

Інбелкульт робіць заходы да вывучэньня эканамічнага становішча і культурнага абслугоўваньня кампалектных беларускіх насьлічтваў у Сібіры і на Далёкім Ўсходзе.

Матар'ялы аб насельніцтве Нэвэльскага павету.

ЦБ Краязнаўства атрымала ад аднаго краязнаўца Нэвельскага павету т. Шавельскага, цэлы шэраг матар'ялаў, што насельніцтва Нэвельскага павету зьяўляецца беларускім: т. Шавельскі абгрунтоўвае свае довады гістарычнымі, моваазнаўчымі, этнаграфічнымі, фольклёрнымі спасылкамі. Ня гледзячы на русіфікатарскі ўплыў, насельніцтва і да гэтага часу захавала асаблівасьці беларусоў.

ХРОНІКА.

ТРЭБА АЗДАРАВІЦЬ КАЎБАСНЫ РЫНАК!

Санітарная інспэкцыя Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР быў нядаўна праведзен абгляд становішча прадпрыёмстваў каўбасных вырабаў.

Паводле матар'ялаў, атрыманых з месц, відаць, што для вытворчасьці каўбасных вырабаў і наогул для пераапрацоўкі мяса ў ніводнай акрузе няма належных адведзеных умоў.

Усё гэта адбіваецца на якасьці прадукцыі, а таксама на рацыянальным скарыстаньні мясных лішкаў.

Адчуваецца вельмі востра пабудова адведзеных каўбасных фабрык, асабліва ў больш буйных гарадох—Менск, Гомель і Віцебск.

Да гэтага часу мы маем толькі дробныя прадпрыёмствы на выпрацоўцы каўбасных вырабаў, значная частка якіх знаходзіцца ў прыватнікаў. Надалей, у мэтах палепшаньня якасьці прадукцыі і задаволеньня патрэб рынку, неабходна, каб уся гэта справа была сканцэнтравана буйнымі мясными арганізацыямі (Белмясгандаль і каапэрацыя), а таксама неабходна прыняць палажэньня меры да аздараўленьня рынку.

Сэкратар ЦВК БССР т. Хацкевіч вярнуўся з водпуску.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. А. І. Хацкевіч вярнуўся з водпуску і прыступіў да выкананьня абавязкаў.

Праэкт палажэньня аб Галоўмастацтве.

Нар. Кам. Асьветы БССР распрацаваў праэкт палажэньня аб Галоўмастацтве пры Нар. Кам. Асьветы.

У хуткім часе гэты праэкт будзе перададзен у Савнарком БССР на канчатковае зацьверджаньне.

Рэалізацыя тавараў беларускай саматужнай прамысловасьці.

Шэйнымі арцелямі беларускага сьматужна-прамысловага саюзу за першае паўгодзьдзе бягучага апэрацыйнага году было ізгатоўлена гатовага адзеньня, спецадзеньня і іншых тавараў на 2.086.000 руб.

З гэтае сумы Белсамтрамсаюзам было прададзена гатовага адзеньня на 315.000 р., а астатняя колькасьць прадукцыі была рэалізавана акрсаюзамі праз нізавую каапэрацыйную сець.

Помнік старажытнага мастацтва.

Нар. Кам. Асьветы БССР узьняў пытаньне аб перадачы Полацкім акрвыканкомам Белдзяржмузэю, згодна пастановы Савнаркому БССР, помніка старасьветчыны (Ефрасіньеўская крыжа).

Зараз пытаньне аб перадачы гэтага помніка вырашана канчаткова, і ў хуткім часе ён будзе атрыман Белдзяржмузэем.

Цікавы гэты помнік, як радкі ўзор старажытнага мастацтва на Беларусі; зроблен крыж у 1161 годзе.

Разгрузка школ нацмен ад шматлікіх моў.

Дзеля разгрузкі школ нацыянальных меншасьцяй ад выкладаньня шэрагу моў Навукова-Мэтадалёгічны Камітэт НКА пастанавіў у польскіх і латыскіх сямёгодках выкінуць з навучальнага плану выкладаньне нямецкай мовы. Адносна разгрузкі першага канцэнтру школ нацмен і другога канцэнтру яўрэйскіх сямёгодак, дык гэта пытаньне пастаўлена на абгавараньне настаўніцтва, якое знаходзіцца на курсах па пераадрыхтоўцы.

Адчыненьне магазыну вайсковых рэчаў.

У хуткім часе менскі нэрабкоп адчыняе на Ленінскай вул., № 28, спэцыяльны магазын вайсковых рэчаў.

У магазыне будзе знаходзіцца багаты асартымэнт матар'ялаў спартыўнага і вайсковага характару для вайсковых гурткоў ТДА-Авіяхіму.

Зараз праводзіцца капітальны рамонт памяшканьня.

Пэрсанальная пэнсія сям'і растрэлянага партызана.

Міжведамсьцьвенная камісія пры Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпецы прызначыла пэрсанальную пэнсію сям'і растрэлянага белапалякамі партызана Шойко, якая жыве ў вёсцы Карпілава, Бабруйскай акругі.

Пэрсанальная пэнсія вызначана ў суме 25 руб. у месяц.

Новая арцель па выпрацоўцы гузікаў.

Беларускі саматужна-прамысловы саюз арганізаваў у Менску новую арцель па выпрацоўцы касьцяных гузікаў.

Прадукцыя гэтай арцелі будзе перадавацца Белкаапсаюзу для рэалізацыі па нізавой каапэрацыйнай сетцы.

Льготны прыгарадны тарыф.

У мэтах павялічэньня масавага праезду пасажыраў у межах прыгараднай зоны—Менск-Жодзіна і Менск—Койданава, з 15 ліпеня ўстаноўлен льготны прыгарадны тарыф з паніжэньнем каштоўнасьці білетаў на 40 проц.

Напрыклад, калі раней па лініі Менск—Жодзіна білет каштаваў 1 р. 37 к., дык зараз будзе каштаваць 83 кап.

Прыём у індустрыйныя палітэхнікумы.

Прыём заяў у індустрыйныя палітэхнікумы БССР ужо распачаўся і працягвецца да 1-га жніўня.

Усяго сёлета ў менскі палітэхнікум будзе прынята 135 чал. і ў Віцебскі—60 чал.

Менскі дзень.

Да восені Менская пашт.-тэл. кантора правядзе пераработаляваньня тэлефоных перагаворных будак, што значна палепшыць умовы карыстаньня міжгародным тэлефонам.

100.000 руб. на мэліярацыю адпусьціў дадатково ўсім акругам Белсельбанк.

108 мясц разьмеркаваў па саюзах Менскі культаддзел ЦСПСБ для паступленьня ў вячэрні рабочы унівэрсытэт.

На 10579600 руб. закупіў Белкаапсаюз прамтавараў і хлебапрадуктаў у III квартале для спажывецкай каапэрацыі.

Культурныя навіны

ПЕРАКВАЛІФІКАЦЫЯ НАСТАЎНІКАЎ.

18-га ліпеня закончыліся заняткі на 6-цімесячных акруговых настаўніцкіх курсах пераквалфікацыі.

Скончылі курсы 100 асоб. З гэтага ліку 60 настаўнікаў атрымлівалі стыпэндыі, а рэшта вучылася за свой кошт, што сьведчыць аб імкненьні масы настаўніцтва да пераквалфікацыі.

Курсанты вучыліся вельмі інтэнсыўна і далі відавочныя вынікі. Пры курсах была арганізавана летняя практычная школа.

30 НАСТАЎНІКАЎ ДЛЯ СІБІРЫ.

Гэтымі днямі Менская Біржа Працы арганізавала сход беспрацоўных асьветнікаў г. Менску разам з слухачамі настаўніцкіх курсаў па пераквалфікацыі беспрацоўных дзеля абгаварэньня прапановы пасылкі ў Сібір і Далёкі Ўсход 30 беларускіх настаўнікаў. Зараз праводзіцца запіс жадаючых ехаць.

ПОМНІКІ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА.

Беларускі Дзяржаўны Музэй набыў у ваўнэй Слуцкай царкве два старэнькіх куфры, зьвадворку размаляваныя вузорамі, якія ўжываліся пры таўстае слуцкіх ласоў. Гэта сьведчыць аб тым, што ў Беларусі ўжо з даўных часоў існавала свая ўласная мастацкая арнамэнтура.

Па акруговых аддзяленьнях Аўтадору.

Працуюць...

Бабруйск, 19-7. На 1-га ліпеня па акрузе налічваецца 30 ячэек Аўтадору з агульным лікам сяброў у іх 952 чал.

З гэтай колькасьці за чэрвень месяц арганізавана 9 ячэек Аўтадору з лікам сяброў 204 чал. Апроч таго, мяецца 13 юрыдычных сяброў Аўтадору.

Акруговым аддзяленьнем Аўтадору валадзеў у г. Бабруйску аўтабусны рух; за апошнія 3 месяцы перавезена звыш 60000 чалавек.

Як мокрае гарыць...

Ворша, 19-7. Усяго зараз па акрузе налічваецца 10 ячэек Аўтадору з агульным лікам сяброў у іх каля 200 чал.

З гэтай колькасьці на райёнах акругі мяецца ўсяго 2 ячэйкі Аўтадору.

Што датычыцца вясковых ячэек, дык гэткіх пакуль што на акрузе няма.

Фізкультурнікі экзамен вытрымалі.

(На ўсебеларускай спартакіядзе).

Учора а 10-ай гадзіне раніцы на Пляцу Волі адбылося ўрачыстае зачыненьне ўсебеларускай спартакіяды.

Пад гукі Інтэрнацыяналу фізкультурнікі — менчане—нясуць чырвоны сьцяг—прыз ЦВК БССР у адзнаку за дасягненьні на фізкультурным фронце.

Праз пару хвілін на трыбуну ўваходзяць прадстаўнікі партыі і ўлады. На трыбуне Сэкратар ЦВК БССР А. І. Хацкевіч, камандуючы Беларускай вайсковай акругай т. Ягораў, прадстаўнік ВСФКБ т. Леў і інш. таварышы.

Вынікі спартакіяды грамадзянскіх фізкультурнікаў абвяшчае т. Задорын.

— Агульнае першынства на спартакіядзе атрымалі фізкультурнікі Меншчыны...

Другое і трэцяе месца падзялілі Віцебшчына і Гомельшчына...

Чацьвертае—Бабруйшчыне і г. д.

Музыка іграе туш...

Слова атрымоўвае Сэкратар ЦВК БССР тав. А. І. Хацкевіч, якога фізкультурнікі сустракаюць гучнымі воплескамі.

— Таварышы! Вітаю ад імя Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР узельнікаў усебеларускай спартакіяды і віншую вас з пасьпяховым яе скончэньнем.

— Правядзеньне спартакіяды—кажа тав. Хацкевіч—саўпала з 8-ай гадавінай аслабаненьня Беларусі ад белапалякаў, саўпала з „Тыднем Абароны“ і гэта саўпадзеньне мае асаблівае палітычнае і гістарычнае значэньне.

Мы імкнёмся да міру, але разам з тым мы павінны прымаць усе меры да таго, каб працоўныя СССР ня былі засьцігнуты ворагам неспадзявана. Асабліва гэта датычыцца БССР, якая знаходзіцца на мяжы з буржуазным сьветам.

Рабочыя і сяляне павінны быць падрыхтаваны да таго, каб умець уладаць стрэльбай, каб у любую хвіліну даць належны адпор нападаючаму ворагу.

Тав. Хацкевіч указвае, што мы маем надзейнага прыяцеля; гэты прыяцель—пралетарыят усіх краін сьвету. Гэты прыяцель будзе самым ненадзейным тылам для нападаючай буржуазеі, але разам з тым мы павінны падрыхтаваць добра свой тыл.

Фізкультура ў нас служыць не толькі як вайсковая падрыхтоўка, але яна нам патрэбна і для штодзённага сацыялістычнага будаўніцтва. Нашы савецкія і грамадзкія арганізацыі дапамагалі і будуць дапамагаць фізычнаму выхаваньню моладзі і дарослага насельніцтва.

У заключэньне т. Хацкевіч перадае фізкультурнікам Меншчыны, якія заняялі на спаборніцтвах па ўсебеларускай спартакіядзе першае месца, Чырвоны сьцяг ад імя ЦВК БССР.

Музыка іграе туш.

Ад імя фізкультурнікаў Меншчыны т. Брадоцкі заяўляе, што лепшыя дасягненьні яшчэ ня значыць, што ўсе задачы выкананы. Сьцяг прымушае нас паставіць шэраг канкрэтных задач, каб яшчэ больш узмацніць працу на фізкультуры.

За лепшыя дасягненьні ў галіне лёгкай атлетыкі гомельчане другі раз атрымоўваюць сьцяг ВСФК БССР—прызы якія мы атрымоўваем на ўсебеларускай спартакіядзе, кажа прадстаўнік Гомельшчыны, яшчэ больш згуртоўвае шэрагі фізкультурнікаў.

Вынікі спаборніцтваў часьцей вайсковай акругі абвяшчае т. Кодар.

Кожную каманду, кожнае прозьвішча, якія паказалі лепшыя дасягненьні на спартакіядзе, сустракаецца ўсімі фізкультурнікамі гучнымі воплескамі.

Перадаюцца пераходныя прызы асобным камандам, і слова атрымоўвае Камандуючы Бел. Вайсковай Акругай тав. Ягораў.

Доўгія і гучныя воплескі ўсіх прысутнічаючых лепш за ўсё сьведчылі аб тым, наколькі працоўныя любяць сваю Чырвоную армію.

Тав. Ягораў адзначыў, што разьвіцьцё фізкультуры працоўных БССР і часьцей Чырвонай арміі ідзе наперад, а гэта дае нам упэўненасьць, што наша армія будзе мець добра падрыхтаваны маладняк.

Мы зброяй ня бразгаем, а лічым сваім абавязкам бараніць нашу палітыку міру. Нашу палітыку міру хоча сарваць буржуазія, а таму нам трэба быць яшчэ больш падрыхтаванымі. Працоўныя павінны яшчэ больш узмацняць баявую моц краіны і быць гатовымі сустрэць свайго ворага з аружжам у руках. У гэтых абставінах нам асабліва патрэбна фізкультура і не трэба яшчэ больш пашыраць і разьвіваць.

Нам, старшыні ВСФК БССР тав. Леў адзначыў, што ўсебеларуская спартакіяда была экзаменам для фізкультурных арганізацый Беларусі. Гэты экзамен вытрыман з гонарам. Наша задача—яшчэ больш ахапіць фізкультурай моладзь і дарослых рабочых.

Спартакіяда зачынілася. Нашы фізкультурнікі экзамен вытрымалі і паехалі на месцы для далейшых перамог на фізкультурным фронце.

Пашкадуйце р. Сьвіслач!

У гутарцы з нашым супрацоўнікам, д-р Магілеўчык паведаміў наступнае аб агляде ракі Сьвіслачы.

— 16-га ліпеня санітарная інспэкцыя Нар. Кам. Аховы Здароўя сумесна з Санітарна-Гігіенічным Інстытутам зрабіла папярэдні агляд р. Сьвіслачы.

Зазначаны кепскія адносіны да аховы чыстаты вады як з боку грамадзян, гэтак і з боку менскага камгасу.

З агляду таксама высьветлілася, што па берагох ракі Сьвіслачы мецца шмат, ня вывезеных гадамі, куч розных адкідаў, каля маста электрастанцыі ў раёе валяюцца дохлыя сабакі, каты і інш. дохлая жывёла.

Апроч таго, р. Сьвіслач забруджваецца брудам з вуліц і прадпрыёмстваў.

Зараз Санітарна-Гігіенічным Інстытутам вядзецца лябараторнае дасьледваньне якасьці вады р. Сьвіслачы.

Вынікі канчатковага абгляду р. Сьвіслачы і дасьледваньня якасьці яе вады паслужаць асновай для распрацоўкі канкрэтных мерапрыёмстваў па яе ахове.

Аднак, ня гледзячы на гэта, належным органам трэба зараз-жа паклапаціцца і прыняць належныя меры да ачысткі берагоў, каб можна было выкарыстаць гэту рэчку у мэтах аховы здароўя.

Пра ваду, хлеб і абед.

Чарэі на хлеб можна лічыць ліквідаванымі. Зайдзеш у магазын МЦРК, пакажаш кніжку, атрымаеш кілё ці два хлеба і ідзеш сабе. Энэргія нашых загатоўчых органаў зрабіла свае справу.

На што-ж скардзіцца пайнчыкі ЦРК зараз і не без падставы? Вядома—на ваду. Фабрычны хлеб МЦРК вільготны, вельмі насычан вадой і дрэнна выпечан. А між тым на Савецкай вуліцы (№ 72) хлебапякарня працаколектыву пякароў пячэ хлеб куды лепшы за фабрычны.

МЦРК неабходна паклапаціцца аб палепшаньні якасьці свайго фабрычнага хлеба. Ён павінен быць пажыўным і здаровым.

Дарачы пра абеды ў рабочай сталоўцы № 3 на Савецкай вул. З таго часу, як функцыі рабочай сталоўкі № 6 (з прычыны рамонту) перайшлі да сталоўкі № 3 (разам з назвай „рабочай“), абеды ў ёй пагоршыліся на ўсе 50 проц., а таксама абслугоўваньне тахнічнага персаналу. Навошта дарамоніцца з тонкімі едакамі? А між тым цэны зьвялісіся ўсяго на 15 кап. (раней абед каштаваў 55 кап. для пайнчыка, а зараз каштуе 40 кап.). На гэта нагоршаньне якасьці абеду вельмі скардзіцца пайнчык.

Трэба, каб МЦРК ужыў належныя захады і паклапаціўся аб надзе, хлебе і абедзе неабходных чалавеку.

С. Эвенчык.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР—КІНО.

ЛЕТНІ САД КІНО «КУЛЬТУРА». Савецкая, 71. — Апошняя навінка дзяржкіно Грузіі „ПЕРШАЯ І АПОШНЯЯ“. Драма ў 8 частках. Зьвыш праграмы—гастролі Л. З. Леанідава і Я. Арэат.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. — Амэрыканскі фільм „ТРЫ ІСПЫТЫ“. Зьвыш праграмы—канцэртнае аддзяленьне.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — Сёньня новая праграма. „ЦЫРК ПОМЭРА“. Пачатак а 7 з пал. гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — Толькі 3 дні—17, 18 і 19 ліпеня працяг 2-й і апошняя 3-я серыя „МІС-МЭНД“ у 10 частках.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ И СТАТИСТИКИ ПРИ Ц. К. С. Б.

— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —

Поступать на курсы можно в любой месяц года

Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.

ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА.

Плата за первый месяц—5 руб, а за остальные по 4 руб. в месяц ВНОСИТСЯ В НАЧАЛЕ КАЖДОГО МЕСЯЦА ВПЕРЕД по адресу: МИНСК, ВСЕКОБАНК, тек. счет № 682.

Подробные условия высылаются за 2 восьмикопеечные марки. С запросами обращаться: Минск, Всекобанк, заочным курсам

ЗГУБЛЕНЫ:

— Сяброўская каапэрац. кніжка № 2586 Левіна І., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 881.

— Пайная кніжка № 2649 Федчулавай П., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 883.

— Каапэрац. кніжка Марціліна Ю. М., выд. МЦРК, кв. 835.

— Асабовая кніжка Зарэцкага Г., выд. К.-Слабодзкім ВВК нараджэньня 1891, кв. 882.

— Дапрызыўная кніжка № 179 Дайнэко Ф. С., выд. Чэрвенскім РВК у 1926 г. кв. 887.

— Вучотная кніжка Камкоўскага Г., выд. Капыльскім РВК, кв. 888.

— Вучотна-конская карт. Шышовка Р., выд. Чэрвенскім гайсковым сталом, кв. 889.

— Вучотна-конская карт. Бандароніча Е., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 890.

— Вучотна-конская карт. Бандароніча І. І., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. 891.

— Вучотна конская карт. Шалупечко А., выд. Чэрвенскім пав. ваенкаматам у 1922 г., кв. 894.

— Інваліда, кніж., пратозаўскія дакумэнты, службовая запіска, выд. менскім акрвыканкомам на атрыманьне з ЦРК пракуктаў і асабовае пасьведчаньне, выд. Мотчанскім сельсаветам на імя Абрамовіча А., кв. 886.

— Сяброўскі білет № 31525 Кублікага З., выд. саюзам С.-Г. і ЛР, кв. 892.

— Пайная кніжка № 2127 Аронівай Н., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 893.

— Пашпарт Хаціна Л. В., выд. Менакрміліц. у 1925 г., кв. 894.

— Пайная кніжка № 3594 Лінінскай А., выд. Барысаўск. ЦРК, кв. 895.

— Інвалідная кніжка Панфілівіча Ц. Н., выд. Мазырск. Акр. Сац. Забесьп., кв. 896.

— Асабовая кніжка № 718 Эпштэй А. М.,